КАЛОСЬСЕ

ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

КНІЖКА 2



ВІЛЬНЯ 1936 ГОД

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.
Адна кніжка — 50 гр.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы.

Зьмест кніжкі 2(6) „Калосься“.

Белар. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 2(6) **1936 г.** **Год II**

МАКСІМ ТАНК *)

НАРАЧ

(поэма)

Прадсьпеў.

Прыйдзём яшчэ, вёска, твае песьняры,
ня з торбаю песьняў жабрачых;
бярозавым смыкам, на струнах зары,
з табой заіграем іначай...

І сядзем на прызбу, на новы парог,
як з песьняй, з вясёлым абліччам,
вярнуўшыся з дальных этапных дарог,
хоць шмат каго з нас не далічыш...

Ты зьвесіш чупрыну саломенных стрэх,
пад песьні і шум разгавораў
і выплывуць зоры на сіні начлег,
на мокрую пашу вазёраў, —

закінуць ў глыбокае Нарачы дно
свой невад — запусьцяць у тоні...
А месяц адвострыць сталёвы нарог:
араць неба чорныя гоні...

*) Максім Танк (нататка аўтобіографічная): радзіўся ў 1912 г., у верасьні, у в. Пількаўшчыне, Пастаўскага павету. Вучыўся перш у расейскай гімназіі, пасьля ў беларускай, тады ізноў у расейскай аж да вастрогу ў 1932 г. Пісаць пачаў у 1928 г., будучы ў Радашкаўскай бел. гімназіі. Друкавацца пачаў у „Часапісе для ўсіх", які выходзіў пад рэд. др. У. Шырана і які з першага нумару быў спынены. Падобны лёс спаткаў і ўсе іншыя часапісы, у каторых пробаваў я сваей поэтыцкай сілы. Вершы, якія сяньня друкуюцца, паходзяць пераважна з 1935 г, які ў маім творстве быў рашучым. У гэтым годзе бліжэй я падыйшоў да жыцьця сялян, з каторымі быў зьвязаны з малых год, а такжа да іх інтарэсаў і да барацьбы за свае правы.

І між польных дарог і глухіх каляін
ноч дымам апусьціцца чорным,
а кволае лісьце бяроз і асін
абвяжыцца хусткай узорнай.

Ды вецер прачнецца, і вугальле зор
пасыпіцца ціха на сёлы;
і ткаць будзе вецер між ніваў і гор
з шаўковага кужалю золак.

Прыйдзём яшчэ, вёска, твае песьняры,
як з сонечнай песьняй гарачай
так з сэрцам пявучым, на струнах зары,
з табой заіграем іначай.

1.

Гэта было ў тую ноч...
як расьцьвілі верасы,
як расьцьвілі у бары
з звонам апаўшай расы.

Сетку Тацяна пляла,
ў хаце так ціха — аж страх!
думы як ніткі ў яе
рваліся моцных руках..

Бацька штось доўга ня йдзе
(скача лучыны агонь) —
шмат каго ў госьці ўзяла
чорная Нарачы тонь...

Гэта было ў тую ноч...
з звонам апаўшай расы
ў цёмным сасновым бары,
як расьцьвілі верасы.

Бедная доля мая,
доля дачкі рыбака,
ў хаце надгніўшай крывой
бацькі майго батрака...

Летам у найму ідзеш —
ў панскім багатым двары
крукам сагнуўшыся жнеш
жыта — калосься — зары...

Гэта было ў тую ноч...
як расьцьвілі верасы,
як расьцьвілі у бары
з звонам апаўшай расы.

2.

Ой ды на зары ды на возеры сінім
ціха плакала
бела кагарка, ціха...

Ў грудзі біліся хвалі мокрыя звонка,
крыльля белыя
ды ламаючы з пенай.

Ўспамінала мо сваю моладасьць птушка, —
дні схаваныя
на дне возера цёмным.

Ці згубіла мо шчасьце сіняе ў пене,
у трысьці густым
шэрай восеньню ў буру, —
як часала ноч косы чорныя ветрам
ды над берагам
у сасоньніку медным.

Ой ды на зары ды на возеры сінім
ціха плакала бела кагарка,
ціха...

3.

Няраз здавалася Тацяне: —
ідзе хтось ціха ля паркану,
нат крокі чуліся ля хаты.
А можа не?..

З вярбой кудлатай
абняўся месяц над затокай
і дзесь за вёскаю далёка
начлежнай песьні блудзіць рэха...

знаёмым шопатам і сьмехам
на шыр палёў васеньніх кліча,
дзе толькі меднае іржышча
і гладзь крыштальная вазёраў,
дзе мые ноч каралі зоры...

Ды ціха, ціха...
толькі думы
васеньні сон цалуе, цешыць,
а сетку новую бяз шуму
вязаць давязвае месяц.
— — — — — — — —

І я няраз ў мурох вастрожных
па шэрым полю сумаваў, —
па тых бярозах прыдарожных,
што на этапах спатыкаў.

Няраз я думаў: як вярнуся,
ізноў шлях пройдзены прайду
з кіём па вёсках Беларусі
і, пад дзяругаю вастрожнай,

шмат вольных песьняў прынясу.
Я іх разсею па дарогах,
ў грудзёх разбуджаных братоў, —
яны ўскалосяць ў сінім полі
у пяразвоне каласоў...

Стальная зрэжа іх машына,
ў стальныя звонкія цапы
падасьць іх весела дзяўчына...
сны — песьні
зжатыя ў снапы.

4.

— І госьця я прывёў, Тацяна, —
сказаў Сымон, —
пераначуе, пойдзе рана
ў дарогу ён.

Перакусіць-бы трохі трэба...
На дно вазёр
расой асыпалася з неба
нямала зор...

Імгла як хусткай абвязала
затоку, тонь...
зблудзіць зблудзілі-бы бяз мала,
каб не агонь...

Ну што-ж глядзіш?.. Давай нам есьці!..
Ну і часы!
Стаіш дзень цэлы, ня прысесьці
каля Касы...

Ня тое, што было калісьці, —
ваду ўзялі,
і сяньня камень будзеш грызьці
з сырой ральлі...

Незнаёмы

Ды што-ж, ці сілы у вас мала? —
склікайце збор!

Ды бараніцца-б уставалі: —
ня даць вазёр!..

Сымон

— Ўсё пачалося гэта летась. —
Садзіся! еш —
я раскажу табе пра гэта,
паслухай лепш.

5.

Як умерзла зямля,
лёдам Нарач як шклом занялася.
Зімы яшчэ ня было,
той год да каляд
цягнулася чорная восень.

У суседа гармонь,
шмат сабралася хлопцаў і дзевак...
Мы — мужчыны — ў кутку
гаворым пра тонь,
гаворым пра хлеб, пра насевак..

Ды з кірмашу прыйшоў
посьле солтыс вясковы Цяцера,
плакаты ў вёску прынёс.
Дзесяткі галоў
схіліліся ўміг над паперай.

„Абарона... ды рыб"...
Ў скулу думалі солтыса ўдарыць.
Ды самі ўзяліся чытаць,
Рыгор і Архіп,
а шум галасоў, нібы Нарач

разшумеўшыся, ў столь
ўдарыў хаты надгніўшай, батрацкай.
Што-ж, хай прыдуць... бяруць...

— — — — — — — — —

Ды пара ужо спаць.
Старасьць, бачыш, і сілы падважыць.
А хочыш — дык слухай яе:
табе расказаць
Тацяна нягорай раскажыць...

6.

Тацяна

А сам з далёку?..

Незнаёмы

Я ня маю сваей хаты...
дзе праца ёсьць, там і начлег.
Хаджу ад вёскі і да вёскі, —
часамі дождж, завея, сьнег...
Нямала ўжо прайшоў дарогаў
і ў дзень і ў ноч пад шопат зор...
часамі скутымі рукамі
абняць хацеў палёў прастор...

Тацяна

Ты вязьнем быў? Ідзеш з вастрогу?..
пачнеш нанова,... ціха жыць...

Незнаёмы

Іду ізноў старой дарогай,
іду ды толькі не спачыць,
а зноў будзіць народ сярмяжны,
каб косы добра адвастрыў,
бо час касьбы ўжо недалёка, —
ды выйсьці трэба да зары
і дзень падняць з пад скібаў грунту;
хай выйдзе нас мазольных раць,
каб веснаход і з песьняй бунту
між ніў разбуджаных спаткаць...

7.

І ціха ноч над вёскай дрэміць,
нат вецер сьпіць і не гавора
ды медным лісьцем верба сьцеліць
зямлю ў асеньнія узоры.
А месяц ў чорным павуціньні
злавіўшы зоры нібы злодзей
спусьціўся сьцежкай цёмна-сіняй
і ціха ў трасьнікі заходзіць...
А Нарач сьпіць, не шалахнецца —
не зазьвініць лянівай хваляй...
памалу возерам пляцецца
васеньні дзень з васеньняй далі.

Вільня 1936 г.

Канец часткі першай.

Бель

З іржавай балотнай вады дзе-недзе чарнелі старыя пакрытыя мохам альховыя пні, мяйсцамі паросшыя атожыльлем і зялёным прошлагоднім ягаднікам. На высокіх курганох - „стаўбунох“ затлела зялёная курганіца. Зрэдка, быццам ня веручы яшчэ вясеньняму сонцу, павылазіла смычка — ды лянiва на вадзе распраўляў шырокае зялёнае лісьце лопух.

— І сюды ўжо зайшла вясна — думаў Пятрусь — гледзячы на паросшае алешнікам і лазой балота, якое хто ведае, куды цягнулася. Ні Пятрусь ні яго бацька ўсяго не прайшоў.

З крыкам зрываліся з пад ног кнігаўкі, дзесь над зялёным кажухом лазы бляяў чэпік адзін, другі... З шумам праляцела над галавой стада дзікіх качак.

Сонца вышэй паднялося над лазой. Мінула цёмна - зялёны альшэўнік і сінюю паласу бярэзьніку — Бель.

Пятрусь памалу ішоў, мясцамі глыбока западаючы ў раскісшае балота. Падыходзячы бліжэй да Белі, курганоў было больш, хмыразьнік гусьцеў, затое бярэзьнік — больш цяглы і раўнейшы.

— З гэтай бярозкі аглобля была-б — думаў Пятрусь. Затрымаўся і слухаў. . Толькі вецер ды балота гаварылі сотнямі збуджаных галасоў. Толькі вецер цёплы, вясеньні, зялёны. Вясной мала хто заходзе ў Бель, хіба лясьнік на цяцярукі...

Вострае лязо тапара звонка ўрэзалася ў камень бярозы раз, другі...

— Будзе ручка ў барану, аглобля, зьвяно... калёсы — а то зусім няма на чым ехаць..

— Раз, два, тры... — лічыць рэха удары тапара. Сыпяцца мокрыя, бярозавыя трэскі...

Але і стук... — чорт-бы яго пабраў — думае Пятрусь — заходзячы з другога боку.

З балота наляцеў зялёны вецер, мацней закалыхаўся бярэзьнік Белі і быццам ад гэтага п'янага вясеньняга шуму пахілілася падсечаная бяроза, трэснула ў камлі, сьцебанула пазялянеўшым венікам белыя, рабыя пні старых бяроз і аціраючыся аб іх, ламаючы вецьце зялёным суччом, як зялёнай чупрынай зачапілася за сук старой бярозы.

І зноў звонка застукаў тапор. З кожным новым ударам прабягала сударга па белай кары бярозы ды мацней выгінаўся ў дугу зачэплены яе верх.

Дзесь далёка, на другім канцы Белі, зашумеў вецер. Шум прыбліжаўся. І не чакаючы на гэты шум — на раскалыханую сьмерць, аддзеленая ад пня бяроза сарваўшыся высока падкінула камель і з стогнам лягла на мокрую пасьцель балота.

— — — — — — — — — — — — — — — —

Цэлае лета ляжаў Пятрусь хворы.

— Каб хто слабейшы, даўно выцягнуў-бы ногі — гаварылі ў вёсцы. Шрот глыбака пазалазіў. Раны гнаіліся. Перш яго лячыў Мікіта, канавал, нейкім карэньнем, пасьля баба Аўдоцьця загаварвала... Досыць таго, што „вылізаўся“.

— Відаць у бацьку ўдаўся, і таго доўбняй ня прыглушыш— гаварылі на вёсцы...

Зімой, пасьля каляд, Пятрусь пачаў зьбірацца ісьці на службу. Сваей зямлі мала, ды якая і была гаспадарка і тую хвароба зьела.

Куды Пятрусь пайшоў, і сяньня ніхто ня ведае. Праўда, пасьля яго на другі дзень прапаў дзесь і лясьнік Якім. Можа ваўкі, а мо' так дзе прапаў. Зіма той год была сярдзітая.

Гаварылі сяляне, што бачылі сьляды Пятрусёвых ботаў дзесь каля Белі... Ды мала што гаварылі. Бель не малая, а сьвет яшчэ большы...

— — — — — — — — — — — — — — — —

Ціха крадучыся, пераклічкай жаб, звонам камароў напаўзае над балотам вясеньняя ноч...

Вылазіць яна з пад зачараванай папараці, з трасьнікоў, з пад шырокіх і гладкіх лісьцяў бабоўніку, з пад раськіненых лап дзядзеўніку, з пад курганоў вылазіць чорная балотная ноч з Белі...
А на захадзе доўга тлеюць недагарэўшыя стагі хмараў.

Вільня—Пількаўшчына
Вясна. 1936 г.

ЖАЎРАНАК

Гэта было рана —
рана,
паласой ішоў вузкой —
вузкой...
Нібы шэрай воўнай даль заткана
мяккаю вясеньняю імглой.

Думкі нібы хмары —
маіх вечных мараў сны
сабраліся на маршчынах твару
у вясеньні, цёплы дзень вясны.

Толькі над вузкім загонам
звонам
зазьвінеўшых сьлёз
з бяроз
жаўранка песьню з пераззвонам
ветру хтось у грудзі ўнёс.

Што вітаеш з песьняй?
Мо' з гары ляпей відаць?
Можа ужо тлее на прадвесьні
новаю зарою неба гладзь?

Шмат раз усхадзілі ў гору
      к зорам —
не глядзець-жа век з мяжы,
      з мяжы...
Што-ж ты раззвінеўшыся гаворыш, —
сваей песьняй-звонам раскажы!

Пількаўшчына 16-III-35.

ВЯСНОЙ

Прысьвячаю т. Н.

Здарылася са мной дзіўнае, сьмешнае, —
   не расказаў-бы таварышам ў цэлі.
   Ў полі і то пэўна-б нівы шырэйшыя,
   нівы гусьцейшыя звонка-б шумелі.

Помню як сяньня чорнымі бровамі
   сны мае ўзмахам адным абарвала,
   быццам-бы рэха барамі сасновымі
   песьняй бяз голасу закалыхала...

Усё-ж-ткі і я быў нязломкам, падумаю, —
   (сам нат ня ведаю, як гэта сталася) —
   шмат раз хадзіў і дарогай вастрожнаю
   нат з пад эскорты ўцякаць удавалася.

Глянула проста вачамі шалёнымі,
   быццам ударыла звонам вясёлак, —
   гэтак вясной над палямі, загонамі
   толькі глядзіць загараючы золак.

Здарылася са мной дзіўнае, сьмешнае,
   не расказаў-бы таварышам ў цэлі,
   бо нат калосьсе, ў полі найменшае,
   сьмехам сваім каласістым шумела б.

Вільня 9-IV-36 г.

ДАРОГАЙ

Йдзе батрачка маладая
жыта жаць у панскі двор,
вочы хусткай выцірае, —
хусткай, што купіў Рыгор.

Эх і твар штось невясёлы.
Думы, думы — каласы!
Што-ж ня цешыць вас і золак
расьцьвітаючай расы?..

„Каб кахаў-бы — не пакінуў“
і ў вастрог-бы не пайшоў...
думу думае дзяўчына
ў жоўтым шуме каласоў.

Як адходзіў, дык казаў ей: —
хутка вернецца вясной...
Ўжо няраз маёвай ночкай
асыпаўся цьветабой...

Пакахаў відаць другую —
пра яе няраз ён пеў...
сэрца — скрыпку залатую
ўдарыў збуджаны напеў.

І жывыя пералівы
паліліся у прастор
песьні вольнай і шчасьлівай,
што калісь пяяў Рыгор.

І напеў яе вясёлы
зьліўся з шумам, з звонам ніў,
быццам хтось гарачы золак
серпам ўдарыў, разбудзіў.

Гаварыла гэта песьня,
што парвуцца кайданы
і ў батрацкай хатцы цеснай
ўбачым сьвет другой вясны.

І паверыла дзяўчына,
што шумеў калосься бор,
што з расьцьвіўшаю рабінай
пэўна вернецца Рыгор.

1936 г.

МІХАСЬ МАШАРА

З ЦЫКЛЮ „ПАДАРОЖЖА“

(Працяг)

XXVI.

Куды цяпер? — Махнём да
„Шляху“,
Паклон Язэпу занясём.
Мы пад яго гасьцінным дахам
Ня раз былі ужо гасьцём.

Прыбаў-жа шагу крыху муза!
Шырок і гладак тратуар.
Набок!.. з дарогі! таўстапузы...
Ідзе тут з музай пролетар.

— Здароў Міхась! — і бачу...
Хведар
Сьмяецца ярка ў вочы мне —
— Здароў братко!.. ах, каб
ты ведаў,
Як я жадаў спаткаць цябе! —

— Ці ты адзін? — А дзе там...
з музай,
— А разагналісь так куды? —
— Ну бачыш, гэта вось
трылуза
Вядзе да „Шляху Маладых“.—

А што чуваць там на
Парнасе?
Ці рушыў „Нёман“?.. Як
„Куток“?
— Кішэнь дзіравы бачыш
ў Стася,
А наш „Куток“ —
Загналі ў самы кут браток.

— Й нічога ў хвалях ня
відацца, —
Як кажуць нашы пэсымісты,
Дык як пяяць? —
І грэх сьмяяцца...
Эх, брат!
Давай — зайдзём, ды выпьем
чыстай.

Бо так жывём!..
Як-бы гарох той прыдарожны,
І сум кругом. —
— Спакінь яго!..
Ня кратай боль.
Прыпомні наш „Парнас“ ва-
строжны.
— Ты харкаў кроў... —
А быў вясёл'!?..

У нас ў грудзёх ёсьць многа
веры
І сілаў знойдзем шмат яшчэ:
І будзень наш — сягоньня
шэры
Хаця ня хоча — расьцьвіце!

XXVII.

Давай, лепш сьвісьнем на
Пэгасаў,
Ды зноў да крат махнём
туды..
Там часьць душы засталась
нашай
І многа дум — за тры гады.

Мінаем, бачыш, пляц базарны,
А вось і гэты мур закляты,
Грамадзкі сорам нашых дзён!
Стаіць пад сумна-жоўтай
шатай
Нічым няўзрушан і сьцюдзён.

У вокнах краты, краты,
краты —
Худыя твары везьняроў...
О людзі!
Навошта гэткі бой зацяты
І столькі мук... і мук —
братоў?!

XXVIII.

О, ты вастрог!
Ў сьцянах тваіх панурых,
У час даўгой, даўгой начы,
Вучыўся я змагацца з бурай
І крыльлі тут расьціў душы.

Тут рос мой дух... мацнела
вера,
Ў тваіх мурох пазнаў сябе,
І песьню першую нясьмела
Тут прапяяла муза мне...

Вось ён ізноў, сымболь
няволі,
Прыют бунтуючых душой.
Я веру — з мук тваіх і болю
Засьвецiць сьвет душы
людзкой.

Мне сьмешны вы — о людзі,
людзі!
Што ваш вастрог і старажы,
Калі ён вольным вечна будзе—
Ён — Дух!..
І несьмяротны і жывы.

XXIX.

Гэй, гэй! скрылаты наш
Пэгасе,
Яшчэ нам службу саслужы!
Узмах адзін — мы на
Парнасе,
На тым вастрожным, як тады.

Тут пастарому ўсё, як трэба:
Наўкола мур і будкі дзьве,
Кусочак сіні, сіні, неба —
Вартоўнік збройны на сьцяне.

Гарод прыгожых красак...
траўка.
Вузкая сьцежачка кругом.
Наўзбоч алька... Пад ею
лаўка
І тры тапалі над муром.

Па два у рад, па сьцежцы
гэтай —
Як мы калісь—адзін за адным
Усьцяж ідуць да нейкай мэты,
Усьцяж таруюць шлях другім.

XXX.

А вось і кут наш гэны слаўны!
І тая „цэль“ ў канцы муру,
Дзе мы натхненьнем усхваля-
ваны
Ляпілі звонкіх „жаўрукоў“.

І „Веснапесьні“ тут радзілісь
І „Зорны шлях“ сьвяц ў сюды,
Часамі мы тут весялілісь,
Часамі плакалі з нуды.

Далей „Шанхай“ і лёхі тыя,
Дзе спатыкаліся з табой
І думы нашы маладыя
Кармілі песьняй і красой.

Вось на муры, ў самым куце,
Мой верш няскончаны відаць:
Якая-сь думка аб пакуце, —
Майго пабыту тут пячаць.

XXXI.

Стаім...
А міма, доўгаю чаргою,
Праходзяць дні загінуўшыя тут:
Ціхія, бурныя парою,
З сьлядамі ўздымаў і пакут.

Іх многа, многа з шэрым
зьместам
І нат бяз зьместу ёсьць
зусім, —
Калі вастрог бываў так
цесным,
Што задыхалісь мы у ім...

За днямі поступ'ю нясьмелай,
Начэй з бязсонніцай паход;
За імі: сум, туга, зьнявера
І дум, і мрояў карагод.

Праходзьце цені ў процьму
далі!
Мінулі вы... Ўспамін — маўчы!
Навошта кратаць боль і жалі,
Што ўсьцяж крываяцца
ў душы.

XXXII.

Але ўжо час далей нам
Бывай вастрог! [рушыць.
Бывай — Парнас!
Істрыць Пэгас ў чаканьні
вушы,
Назад мой пес, вывозь-жа нас!

— Бывай Міхась! — Куды ты
Федзя?
— Выбач, братко, да ўчобы
трэ —
І так з табой, Міхась,
заезьдзіў
Я тут гадзіны пэўне дзьве...

Бывай Пэгас!
Ты волен братка,
Цяпер мы з музай у дваіх
Пайдзём далей па вулцы
гладкай,
Туды — да „Шляху Маладых“.

Адведаць мне прыемна надта
Цябе, Язэпе, дружа мой!
Ў тваім кутку люблю я братка
Спачыць і целам і душой.

Твае трывогі мне знаёмы,
І хворы мы аднэй бядой.
Чакай! — убачым Яе дома —
І незалежнай, і жывой!

XXXIII.

Завальна, — вуліца такая,
Пры гэтай вуліцы ёсьць дом...
Яна гняздо сабе зьвівае,
Вось там —
Пад першым нумаром.

І нат нятолькі ў гэтым доме
Відацца тут Яе сьляды:
Іх знайдзем шмат, па месьце
цэлым
Растуць, як з дожджыку
грыбы.

Хоць мы, наогул, бедны
зьместам,
Але ня формай устаноў
(Калі жадаеце, дык зрэшта,
Іх палічыць я ўжо гатоў):

„Нац-Камітэт“ і „Культ-
Прасьвета“
І „Тэ. Бэ. Ша.“ —
„Крыніца“, „Край“ і „Бел.-
Газэта“
І „Самапомач“, і „Пчала“.

Кнігарні тры (хоць кніжак
мала),
„Шлях Маладых“ і „Інстытут“
І іншых цэлая навала,
Нат' не пералічыш усіх тут.

XXXIV.

Друкарня імені Скарыны, —
Пакой на лева №—3
Станкі... наборы... стук
машыны,
І хварбай пахнуць друкары.

Ня першы раз сюды
прыходжу —
Тут ўсё знаёма крыху мне.
Ізноў цябе, Язэп, знаходжу,
Ў кутку, за працай, пры вакне.

— Здароў Язэп!
— Адкуль ты братка?
— Як бачу, госьць я нечаканы?
— Але жаданы, —
Заўсёды ты, Міхась, між
намі. —
І я, як трэба па парадку,
Вітаюсь ветла з друкарамі. —

Ну што чуваць?
Ці ёсьць навіны?
І як далей ідзе ваш „Шлях“?
— Брыдзём тэй самай
каляінай,
Нялёгка робім кожны шаг.

Але затое саматугам
І незалежны ў працы мы.
— Вяліка ваша брат прыслуга
І Ей — і Маладым.

XXXV.

А дзе-ж рэдакцыя, рэдактар?
Куток мне гэны пакажы,
Дзе часта муз якісь аматар
Нас расьпінае на крыжы.

„Мяцежны“ зьменіць на
„гульлівы“
І ўсё „зігціць“, „блішчыць“ —
уміг
І так паправіць „стыль“,
матывы,
Што не пазнаеш дум сваіх.

— А вось туды, праз тыя
дзьверы,
Калі цікавішся — пайдзем —
Каморка цесна... Сьцены
шэры.
Два крэслы, стол
і кош вялізны пад сталом.

Ах гэты кош... Кош рэдак-
цыйны!
Ён мне знаём,—знаём здаўна.
Страшней за чорта, ён
праціўны
Для маладога песьняра.

А колькі тут надзей схавана,
І думак кінутых мадзец!
І часам, ліра абарвана
Заледзь пачаўшая зьвінець.

XXXVI.

Нясець Язэп мне тэчку з кута,
Вялізна... вагай можа з пуд,—
— А вось браток мая пакута,
Вось колькі вершаў вашых
тут.—
Саджуся я
І разглядаю матар'ялы...
А колькі тут сабрана іх!
Вяршоў, паэмаў, песьняў,
драмаў,
Прыгожых, моцных і слабых.

У кожнай драме, вершу,
прозе
Усьцяж Яна — і для Яе,
Яшчэ хтось кажа, што ня
зможым
Мы нашых бед у барацьбе.

Вось наймалодшы з нас —
Бярозка
І шмат другіх яго гадоў;
Іх песьні — сьветлая дарожка,
Паміж расквечаных палёў.

Далей:
Казлоўшчык, Жук, Улад-
Іміцкі,
Язэп Вількоўшчык і Бартуль.
Ў запале шчыра паэтыцкім,
Кідаюць град скрылатых
куль.

І Хведар часам тут зьмяш-
чаець,
Як ў прыстань „Гмахаў-
Караблі“
І шмат другіх... ўсе апяваюць
Яе разгон і рытм жывы.

XXXVII.

Але разгледзіць папарадку
Язэп ўсяго мне не дае:
— Ты не абедаў пэўна братка?
Дык, калі ласка, да мяне...

У кут ізнова гэту тэчку —
— Абедаць? — добра, я — гатоў!
(Ня варта, бачыш, рабіць
спрэчку,
За пару чарак і бліноў)

———

Я апяваць абед ня стану,
Хоць не сакрэт, але ляпей
Ня робіць ім гэтай рэклямы:
Не адаб'юцца ад гасьцей!

— — — — — — — — —

І па абедзе, як найлепей
Я на тапчан спачыць саджусь
І доўга гутарым з Язэпам,
Пра працы люд і Беларусь!

— — — — — — — — —

XXXVIII.

Тапчан зялёны — на пружы-
нах —
Сваей выгодай мне знаём.
(Ужо ня раз я спаў на нём),
І рыцар гэны бяз дружыны,
(Што мы Пагоняю завём)
Над тапчаном
Таксама добра мне знаёмы
(Работы жонкі Найдзюковай).

XXXIX.

Спачыць прыемна — кожны
знае,
Хто кончыў працу і зьнямог,
А наш спачынак, нас чакае,
На ўзьбярэжжу перамог.

Дык разьвітаемся з Язэпам
І зноў далей ў вандроўны пуць.
Бяздзейнасьць ёсьць вялікім
грэхам
А за спачынак — асьмяюць.

Далей, ізноў далей мы рушым;
Адведаць трэба і другіх
Мы толькі Ей — працоўнай
служым;
Ня знаем лепшых і благіх.

Ня знаем мы: —
Нац-дэмаў і хадэкаў,
Ніякіх „філаў“, ані „ізмаў“,
Усьцяж шукаем чалавека,
Што служыць скрыўджаным
і лішнім.

Яму жадаў-бы быць я братам,
На кожнай сьцежцы і шляху
І праз жыцьцё ішоў-бы разам
І па гарэ, і па лагу.

Але далей!
Вось „Тэ. Бэ. А.“ —
Кіруй жа муза, як прасьцей,
Ты там таксама ўжо была,
І знаеш мейсца і людзей.

XL.

Мястовы сад... Нам па дарозе.
Зайсьці? — ну як тут не зайсьці!
Здалёк ён надта ўжо прыгожы
І томна дрэміць май ў лісьці.

Наўкол прыгожай абгародкай
Зялёны сад абняў тынок
І дрэмле ціха і салодка,
Ў лісьці вясьняны вецярок.

Дарогі, сьцежачкі, дарожкі;
У кожны кут, на ўсе бакі
Пясок ірдзіцца ў сонца косках,
І залацісты, і мяккі.

І кожны куст пакрыты бельлю,
На кожнай клюмбе красак рой.
Пад дрэвы сьцеліцца мяцельлю
Каштанаў пышных цьветабой.

Людзей ня шмат: — паненак
крыху,
Два-тры студэнты каля іх.
Адных дзяцей тут ёсьць
бяз ліку:
І з мамкай, з нянькай і самых.

Усе прыбраны надта ладна,
Вясёл іх сьмех і галасы.

І так прыгожы і павабны,
Як краскі гэтыя вясны.

Усе вясёлы і шчасьлівы;
Жыцьцё іх радасьцю зьвініць.
А праз паркан на іх пужліва
Хлапець аборваны глядзіць.

XLI.

Калі зямля, ты станеш садам,
Бяз меж, парканаў і тынкоў
І жыць пачнём мы іншым
ладам,
Без бедных і багачоў?

Калі заціхне бой заўзяты,
Ў людзкой сям'і, па ўсей зямлі?
І зьнікне зьдзек, прымус
і краты,
І спынім торг сабой — калі?

Калі улягуцца пытаньні:
Навошта, як, калі і што?
І сьцежку праўды і каханьня
Знойдзе жыцьцё?

XLII.

Ўжо сонца нізка... У паветры
Лісткі прахладаю шумяць.
Гадзіньнік звоніць на катэдры—
Гадзіну пятую чуваць.

Далей!
Завернем каля рэчкі,
Праз мост — да „Тэ. Бэ. А." —
туды.
Тут Вільня простае мястэчка,—
Гняздо працоўнай беднаты.

Нярoйны брук і вузкі вулкі.
Бяз лоску мур... Хаднік —
аршын.
І рух ня той -- ціхі, ня гулкі,
А крамкі брудны—бяз вітрын.

Вось паварот і вулка тая.
Лічу парадкам нумары
І шапкай ветліва махаю,
Акну адкрытаму ў гары.

Бягу па сходах... разглядаю,
На дзьверах надпісы здалёк:
— Тут „Тэ. Бэ. А." — далей
чытаю —
І „Родны Край" і „Літ-
Куток". —

XLIII.

Чуваць гамоняць за сьцяною,
Бяз спынку гутарка плыве.
Так ручаёк бруіць вясною
І ў даль ваду сваю нясе.

Скрыпнулі дзьверы — мы
ў пакоі.
Заціхла гутарка на міг
І я ківаю ўсім па волі —
Пераглядаючы усіх.

Якраз, чаргой сваей, паволі,
Як трэ паседжаньне ідзе:
Пытаньні, гутарка, прамовы,
І без чаргі, і па чарзе.

Апошні я ужо пытаю,
(Пытаньні скончаны усе):
— Дзядзькі!
— А як-жа там, у „Родным
Краю",
„Куток" наш рушыце, ці не?

Бо песьняроў мы маем многа,
Ім трэ прытулак дзе нібудзь;
Яны — сьвятляная дарога,
У гушчу цёмную і жуць.

Мне абяцаюць „генералы",
Паправіць лёс „Кутка" і быт.
Ды абяцаюць нeяк вяла,
Хоць я таргуюся, як жыд.

Але канчаецца сабраньне,
Дзядзькі гуторучы ўстаюць.
І разьвітаньні — й пажа-
даньні,
Пара і нам далей у пуць.

XLIV.

Далей, далей! — жыцьцё ёсьць
рухам!
І так кароткі нашы дні.
Здаўна вядома, — той быў
зухам,
Хто не праспаў сваей вясны.

Ўжо ноч на вуліцы мястовай,
Брыду з таўпой па хадніку.
Агні рэклямаў каляровых —
Цьвіцяць, як краскі ў
цьвятніку.

Таўпа вясёла і жывая;
Пульсуе бурна рытм жыцьця.
І толькі тут адна чужая,
Мая тужлівая душа...

XLV.

О, муза!
Ты разбадзялася па Вільні,
А нам далей ў дарогу час.
Чакаюць там нас надта пільна;
Ня верыш? — Вось наказ.

На „бачнасьць“ хутка, братка,
станем
І рукі выцягнем, як трэ,
І перад маленькім „kapralem“
Нічым пачуем мы сябе.

Пайдзём вучыцца быць
жаўнерам,
Вучыцца — біць і забіваць. —
Так сёньня ёсьць на сьвеце
цэлым,
Хаця Хрыстос вучыў кахаць.

1934 г. Таболы.

Канец.

У 10-я УГОДКІ СЬМЕРЦІ К. СВАЯКА *)

(замест вянка на магілу)

Я прышоў тут табе пакланіцца,
Рана змоўклы наш слаўны паэт,
Ад ваколіцаў роднай зямліцы
Прынашу табе ціхі прывет.

Многа дзён без цябе пражыта,
Многа пройдзена розных
дарог,
Многа раз каласілася жыта
На табой апяваных палёх.

Многа гора, нядолі, зьняверы
Перанёс наш працоўны народ
І цяжкі, і туманны і шэры
Нашых будняў жыцьцёвых
паход.

Многа раз пакланяліся сонцу,
Таму „Ўзгорнаму сонцу“ твайму,
І ішлі па стаптанай старонцы
Праклінаючы долю сваю.

Ды жыве моцны дух у народзе,
З новай верай жыве маладняк,
І далей мы ідзём у паходзе
Без цябе ўжо наш слаўны Сваяк.

Хоць ты змоўк... І хоць ліра
разьбіта,
І хоць новыя страты баляць, —
Над Краінай туманам спавітай
Тваіх песьняў акорды зьвіняць.

Я прышоў тут табе пакланіцца,
Рана змоўклы змагар і паэт, —
Хай табе сон сьвятляны
прысьніцца
І ад роднай краіны прывет.

22. IV. 36. Таболы.

*) Гэты верш і наступныя прысланы песьняром у рэдакцыю запозна, дзеля чаго ня зьмешчаны ў першым аркушы і ў адпаведным месцы часапісу.
Рэдакцыя.

* * *

Цябе не пакіну я, вёска,
Растацца з табой не магу, —
На ўзгорках пяшчаных
расплёскаў
У песьнях сьвятляных душу.

І як не талкуй, так звычайна,
Ў дасьледах над ўласнай
душой;
Маё пачуцьцё — гэта тайна
Заручын вясёлых з табой.

Тваім песьняром быць я рады;
І смутак, і радасьць лаўлю;
І хлопцам тваім і дзяўчатам
Пра быль — нябыліцы пяю.

Люблю я ля стрэх саламяных
На варце задумы стаяць
І з вербай вятрам напатканым
І грудзі і твар падстаўляць.

Люблю я туманы і росы,
І шолах лісьця і травы, —
Чаго зразумець мы ня
можам,
Аб чым не раскажуць славы.

Цябе не пакіну я вёска,
Разстацца з табой не магу, —
На ўзгорках пяшчаных
палосак
Спаткаю — разсьвет і зару.

Таболы. 18. IV. 36.

* * *

Ў кашулі бела-палатнянай,
З сяўнёй я выйшаў на ральлю
І над аджыўшымі палямі
Аўсяным золатам званю.

Як цень, брыдзе за мною
сьледам
Буланы конь у баране,
І цёплым, ласкавым прыветам
Чуць, чуць махае грывай мне.

А сонца лезіць без патрэбы
У вочы, твар і валасы
І поле пахне сьвежым хлебам
І хмелем першае расы.

Чужое поле... конь — чужы...
Чужым аўсом кармлю зямлю...
Ды бунт душы маўчы,
маўчы —
Красу вясны я ў верш лаўлю.

Няхай абшарнік таўстапузы
Глядзіць з пагардай на мяне.
Я працы сын... і музай
Служу — і праўдзе, і красе.

Таболы. 29. IV. 36.

* * *

Месяц мокры і срэбны вылазіць з балота...
Расхінаючы гушчу сухога чарота,
Панад чорнай вадою бліскучы й харошы
Лічыць золата жоўтае, золата грошаў
І кідае медзяную рэшту нядбала
У сьлізкую ваду, гдзе ўжо скарбаў нямала...

За балотнай зялёна-рудой палатнінай
Горад дыхае хрыпла, балюча, няўпынна.
Ў вечным грукаце, скрыгаце й стогне каменным
Лічыць грошы — ці грошаў шукае нязьменна.
А бліскучую рэшту ў гарачцы з ахвотай
Гэтак сама кідае ў сьлізкое балота...

1935 г.

НА ПРАДВЕСЬНІ

Шэры дзень пазірае ў вакно,
Шэры дзень, як той пух на вярбіне.
        Пуста, сіне
І туманна ў палёх навакол.

Ручаінамі звоняць равы
Пад лазою, налітаю сокам.
        Гэт, высока
Ў даль сівую плывуць жуpавы.

І хоць сьнег яшчэ ў лесе ляжыць,
Хоць з-за хмар льлецца жаўранка песьня, —
        Ўжо прадвесьне
І так хочацца цешыцца й жыць!

1936 г.

АНТОН ХМУРНЫ

Таварышам па працы ў Бабруйшчыне гэтыя радкі прысьвячаю.

Іх было чатырох

Праз шыбы вакна, закратаванага жалезнымі прутамі, ледзь прабіваўся шэры сьвет. І расплываючыся па сьценах, пакрытых чырвона-зялёнымі плямамі цьвілі, па стаяўшай у куце сьмярдзючай „парашы“ — патрэбніку і сьлізкай падлозе вастрожнае камэры, коўзаўся па тварах і вопратцы чатырох вязьняў.

Зьбіўшыся ля сьцяны ў кучу, яны нейкі час сядзелі моўчкі. Застываўшае цела пасьля перажытых мукаў боязна было крануць, цяжка было на'т парушыць рукою або адкрыць вочы...

Толькі Язэп Апанасік, барадаты старык, апрануты ў доўгую сярмягу і ў лычаныя лапці абуты, ня могучы болю перанесьці, лежачы стагнаў і скрыгатаў зубамі. А пачуўшы ўводдалі шагі на калідоры, палахліва азіраючыся на дзьверы, прабаваў падымацца. Ды напрасна, бо ня меў сілаў... Але ніхто не зважаў ані на яго, ані на ягоныя стогны — звыкліся з імі, як пачалі звыкацца і зжывацца з думкай, што адтуль ніколі ўжо ня выйдуць і вастрог станецца ім дамавінай.

Думкі плылі неяк нястройна і ўсьцяж блукаліся і чапляліся за нейкія перашкоды. Калі катораму з іх пачаў рысавацца вобраз роднае вёскі або роднае хаты і блізкіх людзей — раптоўна пакрываўся ён туманам, які нязначна зьліваўся з брудам асьлюзшых сьцен і падлогі.

Ужо змрок шэрага дня запанаваць зьбіраўся, як раптоўна, зусім нечакана, праз заслюзшае ад бруду вакно ўварваўся, быццам баючыся і саромячыся, сноп праменьняў і пачаў гуляць па агідных сьценах казамату.

Паявіўся так неспадзеўкі, што сядзеўшыя вязьні паўскаквалі мімавольна і, здумеўшыся, азіраліся няпрытомна.

— А бадай цябе, вось праз восем дзянькоў неспадзеўка! Але што-ж тут дзіўнога — ведама сонца. Мусіла-ж яно паказацца — прагаварыў Апанасік і цяжка на падлогу апусьціўся.

— А мы, як дзеці, — узрадаваліся няведама чаго. Падражніцца крыху, а пасьля ізноў запануе тут цемра — сплюнуўшы адазваўся другі вязень — старык Пахомчык.

— Ціхайце, дзядзькі! Гэта-ж добрая прымета, што сонейка праз восем дзянькоў да нас заглянула. Яшчэ, мабыць, сьмерць з касою недзе далёка, яшчэ жыць доўга будзем, калі яно прывет нам пасылае! — палка загаманілі маладыя вязьні, падбягаючы да вакна, бы' баючыся, каб іхныя таварышы сваей грубасьцю не спалохалі гульлівых касулькаў.

— Паглянь, Паўлючок, як сонейка іграе і як зайчыкі па сьцяне скачуць! — цешыўся, як дзіця, хлапец Антоська, брат Паўлючка.

Але нядоўга цешыліся хлапцы з касулькаў. Праменьні, быццам сярдуючы за грубыя заўвагі і за няпрыхільную сустрач з боку старыкоў, як паказаліся нечакана, так нечакана і шчэзлі, і шэрань ізноў пакрыла сьцены.

Дарэмна хлапцы прыпалі да кратаў. Дарэмна выглядалі праз заскарузлыя шыбы — нічога праз іх не маглі ўбачыць і стаялі бязрадна.

— Ах, каб нейкая сіла найшлася і гэтыя пруты паламала!— прагаварыў з мукай Антоська.

— На нейкую сілу, братка, не спадзейся. Не па тое ў сьцяне гэтае жалязьзё, каб было вырвацца лёгка, — буркнуў злосна Пахомчык.

— Дык ці-ж ты, дзядзька, папаўшыся ў катавы рукі, ужо зусім здаўся і ня маеш на'т і надзеі?..

— Надзея, дзіцятка, дурных матка. Надзея... Трэ' пакладацца на сябе, а не на нешта другое. Шмат, седзячы тут, я перадумаў і пастанавіў... Сам разумееш... А калі ўдасца, дык не забудуся я і пра помсту. Але, помсту. Памшчуся за нявінна загубленых сынкоў маіх, за зьдзекі і ганьбу, што дазналі нявесткі і за сваю старую, што штыкамі ей сэрца прашылі...

— Не гавары так голасна, братка, — пачуюць — зашаптаў Апанасік.

— Пачуюць? Хай, сабачыя сыны, чуюць! Казаў я ўжо ім, што яны злыдні і панаваць хочуць разбоем, і цяпер пра гэта сказаць не пабаюся. Мо' па твойму трэ' плакаць і цалаваць ім ногі? Бачу, баішся і дрыжыш пры адным успаміне пра гэтых зладзеяў. Нешта ў тоўк не зразумеў я, за што ты, братка, папаўся. Можа па абмылцы цябе сюды зацягнулі і ўжо восьмы дзянёк разам з намі голадам морацы?

— Хіба-ж не па добрай волі і я тут апынуўся. Двух жаўнераў згінула ў нашай вёсцы... На мяне данясьлі, хоць я невінаваты. На'т дома тагды мяне ня было. Мо', як разьбяруць дзела, дык апраўдаюць.

— Эх, дзядзька, хоць мы і свае тут людзі, але з гутаркі тваей выглядае, што нас ты быццам баішся. Але нам усёроўна: ці ты загубіў гэных жаўнераў, ці хто іншы. Лабазе і тое, што нехта прыпратаў іх з гэтага сьвету. А што да апраўданьня, дык кінь дзядзька і думаць. Канец можа быць усім нам роўны: — куля ў лоб, а там — шукай праўды.

Праўда, гадаць пра другіх не бяруся, яле мяне з Паўлюком спратаюць з гэтага сьвету напэўна. А шкада, бо ўміраць яшчэ рана...

— Пэўне-ж рана — адазваўся Паўлючок. — Сядзі тут у клетцы і чакай, як вол доўбні, а там хлапцы на волі. Пачаць мы пачалі добра, а ня скончылі справы... Розная погань мабыць яшчэ доўга будзе таптацца па нашай зямельцы... — Вось чаму, братка, балюча.

— Пацешся, Паўлючок, што распачатая справа не памрэ. Ёсьць ужо людзі, што патрэбу барацьбы зразумелі.

— А скажэце, браточкі, ці праўда, што яны мучаюць перад сьмерцьцю? — неспакойна спытаўся Апанасік.

— Ці-ж табе, дзядька, далі мала ў косьці і скуру, што цяпер стогнеш?

Ці-ж ня ведаеш, што ў ката ты рукі папаўся і спадзявацца ад іх усяго можна, — спакойна адказаў Антоська.

— Мабыць жартуе хлапец — думаў Апанасік. Ці-ж можна гаварыць спакойна пра такія страшныя рэчы! Не, пэўна жартуе, скаліць зубы з старога. І каб пераканацца, ці Антоська ўсур'ёз гаварыў, ці толькі палохаў, пачаў у хлапца углядацца. Але нічога ў ім ня ўгледзіў. Хлапец, як хлапец. Высокі, плячысты, спакойныя шэрыя вочы.

Не, мабыць казаў праўду,— думаў стары — і сэрца яго зашчымела ад страху. Раптам пачуў, што нешта няладнае дзеіцца з ім і, сам ня ведаючы чаму, падскочыў да дзьвярэй і пачаў аб іх галавою біцца.

— Адчыніце, душагубнікі! Адчыніце, зладзеі! Бярэце мяне на мукі і зьдзекі! — крычаў Апанасік. Вочы яго дзіка блішчэлі, выгляд меў страшны.

— Зусім звар'яцеў ад страху — прагаварыў Пахомчык і сплюнуў.

— Супакойся, дзядька. Гэтым не паможаш. Варта пачуе, сюды ўварвецца і тады разгоняць нас у вадзіночкі, а там звар'яцець лёгка — разважалі хлапцы.

— Дык што-ж рабіць, дзеткі? Лепей хай адразу прыкончаць, а ня зьдзекваюцца болей — плачучы гаварыў няшчасны.

Буйныя сьлёзы цяклі з вачэй старога. Капалі і мяшаліся з крывёю, што цякла з разьбітай галавы і сплывалі па барадзе на сарочку.

Ізноў запанавала цішыня. Камэру пачала завалакваць густая цемень. Уводдалі нехта закрычаў дзіка, а пасьля чутны быў рогат. Пасьля ізноў цішыня запанавала. Ізноў крыкі і рогат і працяжнае рэха паўтарала а-а-а... ой-ой... і праняслося па вастрожным калідоры.

— Чуеце, чуеце, як крычыць нехта? — дрыжучы спытаўся Пахомчык. Некага пад растрэл павялі, дык закрычаў ад страху, а жаўнеры рагочуць... Чуеце? Во ізноў закрычаў нехта. Во, во... яшчэ раз крыкнуў, мабыць не даецца...

— Дзядька, а дзядзька, — шаптаў да старога Антоська. — А каб гэта нам папрабаваць шчасьця?..— Як? Праз вакно? А мо', як увойдуць, тагды...

Кажаш краты агледзіў... паддаюцца... Паўлючок, ты чуеш?

— Але, чую. Не бяда — дамо раду...

Ледзь сшарэла, як яны, выбраўшыся з густых зарасьнікаў, быццам нейкія жудасныя цені, рушылі далей.

Наперадзе адкрывалася небясьпечная дарога. Трэ' было прабрацца праз здрадлівае балота-дрыгву, якое дзе-ня-дзе паросшы было лазьняком і пакрыта куп'ём.

Пахомчык ababраўся за праваднiка. Ён добра знаў гэтую мясьціну і ведаў, куды трэ' было кіравацца, каб не папасьціся у трасуху па пояс або на'т і з галавой, каб болей ужо ніколі ня ўбачыць божага сьвету...

Чапляючыся за кусты, пераскакваючы з купіны на купіну, кіраваўся правадыр у бок лесу, што выглядаў у змроку восенскага вечара, як нейкая таёмная цёмная пляма. А за ім валакліся другія. Аслабеўшага Апанасіка прышлося некалькі разоў выцягваць з трасухі, а калі ён ня мог на'т на нагах утрымацца, тагды мусілі ўсе астанавіцца.

— Больш не магу. Ня маю сілы ступіць ані шагу. Кідайце мяне тутка, а ратуйцеся самі — ледзь выгаварыў Апанасік.

— Не, дзядзька, гэтак ня будзе. Цябе тут не пакінем — адазваўся Паўлючок і, не чакаючы доўга, згроб старога на плечы.

Змрок западаў усё болей і болей. Рабілася цёмна. Ногі коўзаліся і западаліся ў трасусе. Некалькі разоў аддыхалі. Напружваючы апошнія сілы, цяўпліся далей, да чорнае плямы, шукаючы там паратунку.

А вось ззаду разлёгся глухі трэск, пасьля другі.

— На зямлю! — скамандаваў правадыр, — страляюць у нас, мацеры іх трасца. Пранюхалі сьлед наш, як сабакі, але ўжо позна, ня зловяць. Ужо і да лесу блізка, а там, як у роднай хаце.

І зноў як цені папляліся наперад, а посьле зьнiклі ў лесе.

М. ВАСІЛЁК

* * *

Будзіўся усход залатою разорай,
Адплакалі буйныя росы;
І сонца умыўшыся імі — над борам
Расчэсвае русыя косы!

Стаю прад табою, працоўна краіна,
Пясьняр тваіх дзён недапетых
І дзеяў — ня сьцёртых жыцьцём — каляіны
Кладуцца у песьнях поэты.

Дарогі змаганьня, шляхі — пуцявіны
Паклалі сьляды на вас, людзі,
Іх сьлед прамяністы ніколі ня згіне —
Патомкі іх злом не асудзяць...

Ўзьляталі над краем арлы маладыя,
Задорна расправіўшы крыльлі,
І сьпевам будзілі гушчары нямыя,
Аб новым жыцьцю гаварылі...

Я відзеў, як ружы, агністыя ружы,
Сьмяяліся сонцу у вочы!
Віхор іх асеньні са сьвістам варожым
Стаптаў, пахаваў сярод ночы.

І плакала шэрае неба дажджамі
Васеньняю познай парою —
І людзі, бывае, заносяцца жалем
Над сьвежай магілай героя...

Ледзь сонца праз хмары сьмяялася моўна:
— Яны не надоўга завялі...
Ізноў абуджу іх — вясною чароўнай
Ўсплывуць яны ў сонечных хвалях!
. . . .

А. БЯРОЗКА

* * *

Тысячай воч палымяных, распаленых цемрай начною
неба ўпілося ў зямлю; і на цяжкія скібы ральлі
зорныя бляскі упалі; і плоймай злавесна-нямою
чорна у чорных бaрознах цені ліхія ляглі.
Ноч шапталася з ветрам... За полем, шырока ўзгараным
шэрыя хаты, бедныя стрэхі ў зьнямозе паснулі...
Ў стрэхі неба ўпілося зьзяньнем зор палымяных...
Ноч шапталася з ветрам... Так ціха...
Ня чулі
сонныя стрэхі пахілых хат, закарэлыя рукі,
бо цяжкі мазоль тых рук, як цяжкія скібы ральлі,
чорная доля, як чорны хлеб... У ёрмы прынукі
доўгіх вякоў ланцугі волатаў моц упраглі.
. . . .

Тысячай зор палымяных неба ўпілося ў барозны,
ў ціхія хаты... ў жорсткія рукі... ў чорны іх хлеб і соль...
Шэрыя хаты, цяжкія рукі — маўклівы і грозны:
гэтак ціха маўчаць умее толькі магутны боль.

19. II. 36.

* * *

Поле, далёка — шырока поле... І неба над полем
сіняе!.. Неба бяздоннае... Шолах вячэрні палёў
ціхі, як песьня з грудзёў набалелых, што з ветру парывам
па струнах вечару ймкне... І слухаюць нівы...
Гэта песьня, што полымем пеніць кроў...
Гэта песьня — аб волі!

Там
магілы дзядоў пад крыжамі пахілымі дрэмлюць —
зьдзірванелая спадчына сівых гадоў; як чорныя раны
ўеліся доўгія цені крыжоў у шэрую землю,
упалі на жоўць пяску, ўкрылі траву пад сабою
чорным сумам...

Гэтта, на гэтых курганах
вякамі здабычу дзялілі чужыя багі і цары
і крывавыя іх аўтары
дыміліся доўга —
нашай крывёю.

За полем хаты. На стрэхах мох абвіс зялёны,
зьвісьлі стрэхі над хатамі. Неба вячэрні пажар
палымее на шыбах чырваньню... Сьцелецца цень па загонах,
рабска паўзе па зямлі... Моў халодная сталь,
грудзі зямлі халодны...
Вецер ад родных хат...
разьвее мо' гора?..

Хаты — бедныя — цёмныя... Пад вашымі стрэхамі соннымі
сэрца маё!.. Вашай доляй жыве,
вашым болем сумуе...
Вечар пад стрэхамі сьніць сваю думу-тугу веснавую...

З думай-песьняй ад хатаў шырока-разгоннаю
вечар, сэрца, магілы і поле зьліліся ў адзіны псальм —
Крывія!..
І моляцца сонцу разоры,
сонцу, што ўжо дагарае на шэрым попеле хмар.

4. IV. 1936.

ЛІСІЦА І ТХОР

(з нагоды нядаўных падзеяў)

З тхаром ды раз пагневалась лісіца,
Дай на тхара узводзіць нябыліцы:
Што ён паганец, крывадушны,
Што стаўся, падла, непаслушны,
Упарты і заўзяты,
Ну, прост', як чорт які рагаты;
Што тхор лісіцы знаць ужо ня хоча
І свой ў нары заводзіць лад,
Што ён пасвоему мармоча
І на'т лісічай гладкай казцы ўжо нярад!
Што тхор мазгоў ня мае ў галаве
І бяз лісіцы ён не пражыве...
Ну хто-б пазнаў цяпер тхара?
　　А была-ж пара,
Калі у згодзе жыў з лісіцай тхор,
(Аб гэтым ведау увесь бор).
А гнеў пайшоў праз курачку чубату,
Што тхор цягнуў сабе яе у хату.
Якраз у гэтую пару
Лісіца вырвала яе з зубоў тхару.
(На'т на тхара апэтыт мела),
А посьле нарабіла крыку,
Што курачка сама таго хацела.
Тхарок сапраўды раззлаваўся
І у нару сваю схаваўся,
А да лісіцы ані зыку.
Лісіцаў хітранькі народ —
З тхаром ім дружба, — ну, што мёд!
Бо пэўне шмат яшчэ чаго
Дастаць-бы можна ад яго!
Тхару лісіца стала падлізацца:
— Ці ёсьць з чаго табе, браток, злавацца?
Я прад табой нічым не вінавата,
Мы аднае, тхарочак, веры
І пад вясну абое шэры,
Дык адчыні мне, васпан, сваю хату:
Успомнім даўны слаўны час
І зажывём мы разам, як ў раю. —
　　А тхор ў адказ:
— Аддай мне курачку маю. —
І зноў замоўк, — ані мру-мру.
— Ня дам сама я раданькі тхару:
Пратэст на гэта зробім між зьвяроў.
Сабраўшы кролікаў, мышэй, зайцоў,

Да іх лісіца адазвалась гэтак:
— Пратэст нам трэба агласіць,
Што тхор ня хоча мне служыць
І ад якойсь пары — ў сваей нары
Пасвойму вучыць сваіх дзетак.
Суседзі, вы мне памажэце,
Пратэст вось гэты падпішэце:
Каб больш так тхорык не рабіў
І да сябе ў нару мяне пусьціў —
— А... трэба! — таўпа у голас закрычала,
Пасьля пратэст лісіцы падпісала,
Хоць знали ўсе, хоць знаў і Бог,
Што скрыўдзіць тхор яе ня мог.
Хоць кожны з іх, вяртаючысь дамоў,
Калі па розум хто пайшоў,
То аж патыліцу пачухаў
І вельмі, вельмі пажалеў,
Нашто лісіцы ён паслухаў —
Усім яна далась у знакі...
Ніхто, аднак, пярэчыць ей ня сьмеў.
А каб знайшоўся хтось такі,
То дачакаўся-б гэты госьць
Ад той лісіцы добрае заплаты: —
Бо ў сільнага заўсёды ёсьць
Слабейшы вінаваты.

10. II. 1936 г.

Я. ПАЧОПКА

СЬМЕРЦЬ

У адзеньні белым,
З тварам скамянелым,
Бяз носу і воч,
Як шкілет худая,
Брыдкая такая,
У глухую ноч
Босаю нагою,
З ржаваю касою,
Ня ідзець — паўзець;
Праз шнуры, палоскі
Праз месты і вёскі
Сьлед за сьлед кладзець;
І скрыпіць нагамі
І бражджыць зубамі,
Як галодны зьвер.
Там яе ня ждалі:
Хрэсьбіны скакалі,
Спаць ляглі цяпер.
Нібы к свайму брату,
Лезе ў першу хату
Прост на самы кут.
Шчырыць рот бяззубы
І скрыгочуць зубы, —
Штосьці чуе тут.
Вокны заблішчэлі,
Ўсталі ўсе з пасьцелі
На ўсім немы страх.
І на ўсю на вёску
Паплыў чад ад воску —
Плач і енк і жах.
А пачвара ў белым
З тварам скамянелым
Там далей ідзець.
І ад людзкой згубы
Шчырыць рот бяззубы,
Як заўсёды, — сьмерць.

Яз. БУРАК

Шчасьце

Аднойчы журналісту аднаго популярнага часапісу захацелася напісаць фэльетон аб шчасьці. І ён пайшоў шукаць адпаведных да гэтага матарыялаў.

Па мармуровых сходах ён падняўся на паверх і пазваніў у парадных дзьвярох міністра. Яму адчыніла прыгожая сакратарка і праз цяг раскошна ўмэбляваных пакояў, падлогі каторых пакрывалі скуры зьвяроў, а са сьцен паглядалі паважныя твары рыцарскіх продкаў (nota-bene купленых у ведамай антыкварні), правяла яго ў пакой міністра.

Журналіст спытаўся:

— Што Вы думаеце аб шчасьці?

— Шчасьце — адказаў міністар — гэта ніколі не асягнуты ідэал. Гэта граніца, да каторай, у сваім поступе да дасканальнасьці, імкнецца чалавек, а каторая з хвілінаю асягненьня яе робіцца далейшай. —

Кар'еру сваю ён пачаў ад перапісываньня актаў у міністэрстве. Цяпер-жа лятуцеў аб утварэньні ўласнага кабінэту. З гэтае прычыны ён нават цярпеў на бязсонніцу і піў валер'янавыя каплі.

— Ці шчасьлівыя Вы цяпер? — кінуў пытаньне журналіст і выцягнуў з кішані запісную кніжку.

— Цяпер у нас зьмена кабінэту — з выразна нездаволенай мінай сказаў міністар. — Калі місыя тварэньня новага кабінэту прыпадзе майму праціўніку — я страчу сваё становішча міністра. Але праз уплывовых пры двары людзей і з помаччу мае прыгожае жонкі я раблю стараньні, каб стварэньне новага кабінэту даручылі мне. —

Праз далікатнасьць журналіст ня спытаўся аб палітычных плянах яго прыгожае жонкі, а ня хочачы сваёй далейшай прысутнасьцю перацягваць струну узаемнага даверра, пакінуў міністра аднаго думаць над магчымымі шансамі яго перамогі. Урэшце ён добра ведаў аб заўсёды аднолькавай палітыцы жанчын.

Ён зайшоў да багатага купца колёніяльных тавараў і спытаўся:

— Як вы сабе прадстаўляеце шчасьце?

Але купец быў знэрваваны. Ён нават раней вярнуўся з свайго магазыну vis a vis катэдры (суседзтва гэта зусім не перашкаджала яму браць падвойныя цэны і глядзець на рукі сваіх работнікаў) і сядзеў цяжка задуманы над апошнімі „Запіскамі Гелды“.

Ён сказаў:

— Гэта апошняе сьвінства перашкаджаць людзям у працы... Я зусім ня маю ахвоты адказваць на недарэчныя пытаньні. Я ня ведаю, што сталася з маімі караблямі, каторыя вязьлі з Бразыліі

каву. Калі яны патанулі, мяне чакае банкруцтва. Прытым акцыі „Indiana electro“ упалі на 15 %. Магчыма я павешуся... —

Журналіст ня любіў цягацца па судох і не хацеў быць сьведкам прыкрага зьявішча...

Па брудных, разгойданых, дзеравяных сходках ён спусьціўся ў цесную сутарэну, дзе жыў шавец. Са сьцен сутарэны густымі каплямі сьцякала вільгаць, а праз малыя звонку балотам аблепленыя шыбы відаць былі толькі ногі праходзіўшых.

Шавец сядзеў пры малым стале і моўчкі да старога бота прыбіваў абцас. Строга-паважны твар яго ніколі не раз'ясьняўся бясклопатнай усьмешкай, а задуманыя вочы зналі цану жыцьця. Чэцьвера яго дзяцей, поўзаючы па бруднай падлозе, турзалі адзін другога і забаўляліся чорным заморапым катом. Ціхім нясьмелым голасам скардзіўся крыўджаны зьвярок. На дзеравяных нарах, у бярлозе прагніўшай саломы, атуленая старай вопраткай ляжала хворая жонка шаўца. Яна нярухомымі вачамі сачыла за мокрымі плямамі на сьцяне і час ад часу кратала пабялеўшымі вуснамі. Магчыма яна думала, якім спосабам заўтра ашукае галодных дзяцей.

На запытаньне журналіста аб шчасьці, шавец падняў на яго свае сумна-задуманыя вочы і ціха сказаў:

— Ня ведаю... я ніколі не адчуваў шчасьця. —

— — — — — — — — — — — — — — — —

У многіх яшчэ мясцох быў журналіст і нідзе не знаходзіў шчасьлівых людзей. Ніхто ня мог выясніць яму сутнасьці шчасьця. Расчараваны гэтым, ён пакінуў роднае места, дзе вечны рух раслайваў думкі, а людзі, сьціснутыя ў шэрыя рамы штодзеннага жыцьця, ня бачылі сьвету акружаючых зьяў, і ў строгім адзіноцтве сярод дзікай прыроды стараўся знайсьці адказ на пастаўленае пытаньне. Сярод мохам паросшых каменьняў, у скальных распадзінах гор і між гарачых пяскоў пустыні шукаў натхненьня дзеля развязкі мучыўшай яго загадкі.

І раз, калі ўжо ў душу закраўся агонь сумніву, а расчараванае пачуцьцё ўласнай годнасьці кідала яго ў сеці капітуляцыі, у дзікім мейсцы паросшым калючымі кактусамі, у рамах крутых скалаў ён пабачыў чалавека.

Чалавек сядзеў на камені і белымі выліняўшымі вачыма, у каторых ня іграў агонь жыцьцёвае жарсьці, сачыў за ценямі, снуючымі ў цёмных заломах. Рукі і ногі яго пакрывалі разьедзеныя жарам струпы. Такія-ж струпы, цякучыя ліпкім гноем, казілі рысы твару, а гніючае цела, адвальваючыся кускамі бурнатнага мяса, тварыла адну зіяючую зьніштажэньнем рану. Парваная вопратка яго была набракшая гноем абсьлізлых струпоў і шчыльна прыліпала да худога цела.

Пабачыўшы журналіста, ён спытаўся:

— Чаго ты шукаеш тут?

— Я хачу разьвязаць праблему шчасьця — зьбянтэжаным голасам адказаў журналіст — і спалохана адступіў назад. На яго нэрвовую сыстэму дрэнна дзеіў выгляд гэтага чалавека.

— Я даўно ўжо разьвязаў праблему, каторую ты называеш праблемай шчасьця, – прашаптаў струплявы.

— У моладасьці сваёй я жыў у раскошным замку. Сьцены яго былі з шэрага мармуру, а крышталовыя падлогі засьцілалі дарагія дываны прывезеныя з Тэгэрану. Дванаццаць чорных нявольнікаў насілі надамною беласьнежныя веяры і курылі пахучыя зёлы ў сярэбраных кадзільніках. Чароўныя танцоркі з гібкім як чарот і цьвёрдым як алябастар целам танцавалі перадамною ўсходнія танцы і igралі на цытры. Прыгожыя жанчыны чакалі ласкі мае і млелі ў маіх абняцьцях. Багі любілі мяне, а людзі падаючы перадамною славілі маё імя. Але сэрца маё было раўнадушнае, а душы заснуўшай у салодкай сьмязе сталага перасыту не хапала жыцьцёвых жаданьняў.

Раз, вечарам, накрыўшыся чорным плашчом, праз таемны праход я выбраўся з замку. У цёмным завулку, сьцены якога ніколі не прапускаюць сонца, я пабачыў двое людзей, абапёртых аб сьлізкі мур. Праз парваную адзежу іх сьвяцілася цела, а ў вачох ламаліся блескі безнадзейнасьці. Яны шапталі пабялеўшымі вуснамі: „мы ня маем дзе спаць.. нам холадна"... і шчыльна туліліся да сябе. Я пайшоў далей і пабачыў ляжачага чалавека. Другі моўчкі стаяў над ім і сумнымі вачамі глядзеў у туманную даль цёмнае вуліцы. У руках яго быў закрываўлены нож. Усюды, як цені, снавалі людзі. Твары іх былі шэрыя, а ў вачох з праблыскамі надзеі змагалася роспач.

— Тады ты зразумеў уласнае шчасьце — прабарматаў журналіст.

— Так. І адначасна згубіў яго. Я зразумеў, што няма вечных формаў і ў душу маю закраўся цень сумніву. Дарма блазьнюкі, творачы дзіўныя штукі, качаліся перадамною, а гнуткія танцоркі, з целам як алябастр і стройнай лініяй бёдраў, круціліся ў шалёным рытме ўсходняга танцу. Сум не ўцякаў з майго твару, а ў душы пасяліўся рэзкі страх перад няведамым.

Прышоў дзень і дзіка голасам крыві выючая таўпа збунтаваных людзей, цесным абручом сьмерці, абкружыла мой замак. Ўзяўшы з сабой золата і жанчыну, каторая мяне кахала, праз таёмны праход я вышаў з замку. За золата я купіў некалькі караблёў і наладаваўшы іх дарагімі тканінамі адправіў у паўночныя парты халоднай Скандынавіі. А жанчыну зрабіў сваёй каханкай. Але і ў гэтых абставінах я ня быў шчасьлівы, бо і тут прасьледавала мяне бязлітасная здань страты. Так мучыўся я, пакуль лёс няўтомным мячом сваім не перацяў струну хваравітай няпэўнасьці. На далёкіх паўночных астравох піраты напалі на мае караблі. Жанчына, каторую больш за ўсё кахаў я, з прыяцелем маім пакінула мяне. А цела маё пакрылася струпамі страшнае заразы.

Тады, прышоўшы сюды, я зразумеў, што згубіў ужо ўсё і да мяне вярнуўся спакой будучых дзён. У гэтым і крыецца сутнасьць шчасьця. Цяпер яно з усіх старон акружае мяне, бо я губляць нічога ўжо ня маю.

Аднак струплявы мыляўся. Ён меў яшчэ да згубы жыцьцё і на гэтым ламалася конструкцыя яго шчасьця. Журналіст добра ведаў гэта, але не сказаў нічога. Ён толькі спытаўся:

— Дык цяпер ты шчасьлівы?

— Цяпер мяне не зьядае гарачка вашага жыцьця. Удзень вялікасьць натхнёнае цішы пранікае ў душу, а сонца цёпла ласкае мае плечы. Уночы неба разгартае надамною сваю зорную мудрасьць і месяц залатым колерам малюе скалы майго ўзгалоўя. Зьвяры не чапаюць мяне, а сабакі ліжуць мае раны. Калі хочаш пазнаць сутнасьць шчасьця — астанься са мною. Тут ты забудзеш клопаты будзённага жыцьця і ў душу тваю ясным лучом пранікне прызнаньне няштодзеннае шчаснасьці. Уночы месяц будзе сьвяціць над тваім узгалоўем, а днём сабакі будуць лізаць твае раны. —

Але журналіст адмовіўся. Ён нядаўна купіў новае ложка з сяньнікам на пружынах і ня любіў сабак. У родным месьце чакала яго больш прыцягваючая сутнасьць з сучасным разуменьнем маральнасьці і валасамі a-la garson. З ёю маніўся ён правясьці менш цікавы вечар на прэм'еры „Гамлета“ ў Летнім Тэатры і больш цікавую ноч у прытульным змроку аднаго з кабінэтаў Cafe-Lux.

Прытым, ня гледзячы на новую няўдачу, ён хацеў кончыць фэльетон аб шчасьці.

— — — — — — — — — — — — — — — —

Праз пару дзён у сталічным популярным часапісе, густа нашпікаваным навуковымі тэрмінамі, з фотографіяй здэтронізаванага ўладара ўсходніх танцорак і з пакліканьнем на слаўныя сілы вучоных сьвету паявіўся фэльетон аб шчасьці. Пасьля падрабязнае аналізы духовых працэсаў праз прызму зьменнасьці вонкавых зьявішчаў, ён сынтэтычна канчаўся наступнай аксыёмай, выдрукаванай прыгожым курсывам: „...сутнасьць шчасьця знаходзіцца ў папярэднім страчаньні ўсяго, каб пасьля ня траціць нічога. Заклікаем шэрыя масы грамадзян актыўна і пасыўна імкнуцца да свайго шчасьця“.

Журналіст лічыў, што цяпер шавец паверыць у шчасьце.

ВЯСЕНЬНІ МОНТАЖ

Апошні сьнег выпаў учора,
а сяньня
шчыліна вуліцы украла сонца.
На шыбінах дамоў расплыўся
блеск золата,
і плача ваконца
сутарэны,
глытаючы
халоднае
балота.
На тварах радасьці сьпякота
крычыць бунтарны крыві
гымн.
Прачнуўся сакавік і ўлез у
жылы,
пульсуе шалу сьвежы рытм.

І рух, і сьціск, і сьвята
вясны навокал,
а сонца з неба зьнятае
купаецца
ў балоце
рынштокаў.

У абняцьцях брамы туліцца
чорны
худы
абарваны
няшчасны.
Мысьлі пры цёмнай труне
ў сутарэне
памёршага сына сухотніка,
заўсёды працоўнага, —
сяньня спакойнага
ў сьне.

Губы штось шэпчуць сіроча-
жалосныя.
Блескі галоднай заразы
ў вачох...
Заўтра жывіцеля сынка
спакуюць на воз.


Беласток.

Філёзофія жыцьця засьмяецца
монэтаю,
кіне ў руку асьлізганы грош.

Гора іх выгнала і хворая маці...
— пан купіць для пані кветкі,
пан купіць для пані кветкі,
пан купіць... —
але вочы сьмяюцца Анэткі —
сэрца сонцу ўдарыла гымн,
парка туліцца ў шыбах бліску-
чых вітрын.
— Малы прэч,
прад табою мы кветкі! —

Газэтчыку нехта
ў балота рассыпаў газэты;
нехта кінуўся з мосту
[у рэчку, —
сіні твар
вочы ўсьцешыў Анэткі
і фотографная кліша абняла
[выпадак,
і толькі
мэгафон у бульварах распла-
каўся тангам,
а вочы вымоўны прыняўшы
задатак
разсыпаліся сіньню па бруку.

І ўсюды сьнег адкрыў балота
і выцягнуў на верх сэнсацыю
дзён,
што спала ў цені душных
сутарэн
пад дахам крыўды, зла —
і getto.
На вуліцы сьціск і сьвята
вясны навокал,
а сонца з неба зьнятае
купаецца
ў балоце
рынштокаў.



ФРАНЦІШАК СКАРЫНА
першы беларускі друкар

Ад. СТАНКЕВІЧ

Доктар Францішь Скарына і яго культурная праца *)

З нагоды 450-лецьця яго нараджэньня

(1486—1936)

I. Агульныя ўвагі.

Гаварыць аб Фр. Скарыне і яго культурнай працы, — гэта знача пазнацца з жыцьцём вялікага беларускага культурнага дзеяча з XVI ст. і з яго перакладамі Бібліі на тагочасную беларускую мову. Прадтым аднак, як аб гэтым гаварыць, мушу зрабіць наступныя агульнага характару ўвагі.

Вучоныя пачалі цікавіцца Скарынай тады, калі сталі ім вядомыя яго перакладаў і яго друкарскіх захадаў кнігі. Зацікаўленьне гэта пачалося ад 1776 году, калі бібліотэкар Расейскай Акадэміі Навук у Пецярбурзе Бакмэйстэр у бібліотэцы тэй-жа Акадэміі знайшоў некалькі скарынаўскіх друкаў. Аб гэтых друках напісаў ён свае ўвагі ў двух кніжках аднаго зьместу: „Essai sur la bibliothéque de l'Acadamie des Sciences à St.-Petérsbourg. 1776“ і „Опыт о библіотеке Императорской Академіи Наук. СПБ. 1779“.

Узноў жа неўзабаве былі знайдзены ў бібліотэцы царскага расейскага Мін. Загр. Спраў іншыя чатыры скарынаўскія кніжкі. Аб гэтых напісаў свае ўвагі Штриттер у зборніку: „Опыт трудов вольного Россійскаго собранія. М. 1783.

Больш грунтоўныя ўрэшце досьледы над Скарынай пачаліся тады, калі чэскі вучоны славіст Добровскі ў 1792 г. адведаў Пецярбург і бліжэй пазнаўся з скарынаўскімі кніжкамі. Пазьней пісаў ён аб іх у выд.: „Slovanka“ (Prag 1814, I і 1815, II) і ў кнізе: „Geschichte der Böhmischen Sprache und ältern Literatur“ (Prag 1818) і ў іншых.

І яшчэ розныя іншыя аўтары пісалі аб Скарыне, але ніхто з іх не пасьвяціў сваей увагі працы Скарыны, як цэласьці. Першы даканаў гэтага П. В. Владимиров у ведамай грунтоўнай кнізе: „Доктор Франциск Скорина, его переводы, печатные изданія і язык. СПБ 1888 г.“. Кніга гэта сталася выходным пунктам для ўсіх тых дасьледчыкаў, якія пазьней працавалі над справай Скарыны. Ёсьць яна гэным пунктам для вучоных Скарынаведаў аж

*) Рэфэрат, чытаны ў Бел. Інст. Гасп. і Культуры ў Вільні 1. III. 1936 г.

да сяньня. І да сяньня ня то што лепшай, але роўнай Владимирова працы не напісаў аб Скарыне ніхто, хоць пісалі даволі многія.

Пасьля Владимирова найбольш заслужвае на ўвагу І. Шляпкін, які знайшоў у Падуі ў унівэрсытэцкім архіве дакуманты, апублікаваныя ў „Чтеніе в Обществе Нестора Летописца" 1894. VIII, аб тым, што Скарына здабыў доктарат мэдыцыны ў Падуі, а такжа заслужвае на ўвагу А. Миловидов, які гэтак сама важныя дакуманты знайшоў ў Коенігсбэрскім архіве, датычачыя жыцьця Скарыны ў 30-ыя гады XVI ст., апублікаваныя ў „Известія Отделенія Русскаго Языка и Словесности" 1917, т. XXII, кн. 2, Петроград 1918.

Апрача гэтых аўтараў, пісалі аб Скарыне пасьля Владимирова і розныя іншыя: расейскія, беларускія, польскія і ўкраінскія, аднак усе яны — паўтараю — калі йдзець аб сутнасьць справы, аб фактычны матар'ял, больш ад Владімірова не сказалі бацай нічога.

Гэтым хачу сказаць, што ўсе тыя вучоныя, якія працавалі над Скарынай пасьля працы Владімірова, апрача ўспомненых Шляпкіна і Міловідова, ня далі нам новых аб Скарыне фактаў, новых дакумантаў, новых вестак. І слушна кажа Ул. Пічэта: „Падлічваючы ўсю літаратуру аб Скарыне на працягу 150 г. ад дня выхаду першае працы аб Скарыне Бакмэйстэра, можна сказаць, што літаратура аб Скарыне мае адну арыгінальную працу прафэсара Владімірова. Большасьць аўтараў, якія пісалі пасьля Владімірова, шырока карысталіся яго фактычным матар'ялам, ішлі за яго вывадамі" *). Але з гэтага зусім не вынікае, што яны агулам аб Скарыне ня далі нам нічога новага. Не. Яны далі нам такжа нямала, - яны ведамыя ўжо аб Скарыне факты, ведамы ўжо матар'ял і весткі прадставілі нам у ясьнейшым сьвятле, яны ведамы аб Скарыне матар'ял лепш апрацавалі, паглыбілі, выясьнілі і парабілі з яго часта сусім новыя выснавы.

Аб Скарыне — паўтараю — пісалі вучоныя расейскія, польскія, украінскія. Усе яны, з малымі выняткамі, Скарыну пераважна прысвойвалі сабе. Бліжэйшая аднак распрацоўка фактычнага аб ім матар'ялу, паданага Владіміровым, нават і праз некаторых чужых навейшых аўтараў, нязьбіта паказвае на тое, што Скарына беларус нацыянальнасьцяй, што мова яго перакладаў беларуская і агулам, што гэта вялікі беларускі культурнік XVI ст.

Але вось гэткае асьвятленьне Скарыны на падставе ўжо ведамых аб ім фактаў ёсьць дзелам прадусім беларускіх вучоных. Дасьледваньне сярод беларусаў Скарыны асабліва ажывілася, пачынаючы ад 1925 году, з нагоды 400-лецьця беларускіх скарынаўскіх друкаў. Беларускія вучоныя праз дзесяць апошніх

*) Ул. Пічэта, 400-лецьце беларускага друку. Менск 1926, бач. 327.

гадоў нямала кінулі на асобу Скарыны сьвятла іменна з пункту гледжаньня беларускага нацыянальнага і беларускага культурнага.

Вось імёны гэтых беларускіх вучоных: Ул. Пічэта, М. Піотуховіч, Янчук, Язэп Воўк-Левановіч, М. Шчакаціхін, Ігнатоўскі, Гарэцкі і інш.

У 1925 годзе, з нагоды ўспомненага 400-лецьця беларускага друку, напісаў і я брашуру: „Доктар Фр. Скарына—першы друкар беларускі"; працу сваю апіраў я на Владімірове, але, у меру сваіх скромных сіл, асьвятленьне ей так-жа даў беларускае.

Вось-жа цяпер, забіраючы аб Скарыне голас з нагоды 450-лецьця яго нараджэньня, я, праўда, ізноў паўтару тое, што тады пісаў. Зраблю аднак гэта яшчэ больш крытычна і вазьму пад увагу ўсё тое, — наскольні гэта мне ведама, — што новае аб Скарыне за апошнія дзесяць гадоў у навуцы паявілася. А гэткімі-ж працамі заслугоўваюць на ўвагу прадусім вышэй прыточаны зборнік менскіх прафэсараў: „400-лецьце беларускага друку", Менск 1926, бач. 360; рэцэнзія на маю брашуру Н. Łowmiańskaha ў „Ateneum Wileńskie" 1925 г. кн 9, „Cztery wieki drukarstwa w Wilnie" — L. Abramowicz, Wilno, 1925, „Kwartalnik Historyczny" (XL), 1926 г. — Ул. Талочка: „Да справы веравызнаньня Фр. Скарыны" („Калосьсе" 1935, кн. 3).

II. Час, у якім жыў Фр. Скарына.

Час, у акім жыў Фр. Скарына, у гісторыі Беларусі адзначаецца, як час разьвіцьця беларускага народу, як залатая пара ў жыцьці ягоным.

Падставы, ці лепш сказаць зародкі такога разьвіцьця ў Скарынаўскі час — народ наш вынес з сваей мінуўшчыны. Народ наш за час сваей поўнай самабытнасьці да XIII ст. і за час свайго так-жа цалком вольнага, але супольнага з Літоўцамі жыцьця ў XIII і ў XIV ст. сфармаваўся ўжо ў выразную нацыю, а так-жа набраў палітычнага і культурнага гарту.

Гэткае асьвятленьне часу Скарыны, гэта знача XV і XVI ст., Ловмяньскі ў сваей рэцэнзіі маей брашуры называе памылковым. „Autor — кажа ён — usiłuje nawet naszkicować epokę, w której żył Skoryna, co mu się nieszczególnie udaje. O stanie kulturalnym Rusi litewskiej w owym czasie ma on błędne wyobrażenie: mówi o rozkwicie (str. 19) tam, gdzie panował zupełny zastój i zanik objawów życia duchowego" *).

Здаецца аднак мне, што хутчэй мыляецца Ловмяньскі Увесь XVI век у беларускай навуцы завецца залатой парой беларускай літаратуры не беспадстаўна. Завядзеньне ў Вял. Кн. Літ. многіх

*) Ateneum 1926, 9, бач. 162.

друкарняў, выданьне аж трох Статутаў у беларускай мове, гэных сапраўды вялікіх падстаў праўнага жыцьця нашай мінуўшчыны, тлумачэньне Скарынай на беларускую мову кніг сьв. Пісаньня, іх друкаваньне ў Празе і ў Вільні, а пасьля перадрукоўваньне ў іншых мясцох і пашыраньне ў народзе — ўсё гэта хіба-ж ёсьць доказам не застою духовага, аб якім кажа Ловмяньскі, а наадварот — доказам, як на той час, даволі вялікай ступені культуры нашага Краю агулам і культуры беларускага народу.

Пэўне-ж, тагочасная наша культура не магла раўняцца з культурай Зах. Эўропы, аднак яна існавала і памысна расла, карыстаючы з культураў антычных і з культуры тагочаснай Эўропы: сярэднявечнай і гуманізму, разьвіваючыся на самастойных беларускіх карэньнях.

Іншай аднак ад Ловмяньскага думкі аб гэтым усім праф. Ул. Пічэта, які між іншым так піша: „На юбілей Скарыны адгукнуўся ў Вільні і Ад. Станкевіч. Невялічкая памерам праца яго ёсьць вельмі ўдалая спроба навукова-популярнае характэрыстыкі дзейнасьці першага беларускага друкара. Апошняя разглядаецца ў адпаведнай культурна-гістарычнай абстаноўцы“ *).

Іншых так-жа ад Ловмяньскага паглядаў і праф. М. Піотуховіч, які аб гэтым так кажа:

„Старадаўна - беларускае пісьменства ў сваім разьвіцьці ўтварае рэзкую крывую лінію.

У XIV і XV сталецьцях бачым зараджэньне беларускага пісьменства; першыя ўсходы яго; у XVI ст. гэтае пісьменства дасягае ў сваім разьвіцьці кульмінацыйнага пункту і, урэшце ў XVII і XVIII стаг. назіраецца паступовы спад літаратурнае хвалі.

На самым высокім грэбні гэтае паступова ўзрастаўшае і спадаўшае літаратурнае хвалі ў XVI ст. уздымаецца магутная постаць Фр. Скарыны, які мае найвялікшае значэньне як культурна-нацыянальны і літаратурны дзяяч старажытнае Беларусі“ **).

(д. б.).

*) 400-лецьце... бач. 319.
**) 400-лецьце... бач. 157.

Ад. САЛАДУХ

Зацемкі аб повесьці Вінцука Адважнага „Хлапец“

Ужо бадай паўгоду, як вышла ў сьвет пад гэткім назовам беларуская повесьць. Пасьля выхаду гэтай кніжкі давялося мне чытаць і чуць вострую яе крытыку. Вось-жа з некаторым упярэджаньнем узяўся я за чытаньне „Хлапца“, а думкі, што ў мяне пры гэтым паявіліся, выражаю на паперы.

Назоў повесьці ёсьць звычайна больш-менш тым, чым ёсьць рэкляма для якога тавару. Чуў я, што адна нямецкая Handelsakademie мае ўжо адумысловую катэдру рэклямы. Хоць патрэба адпаведнага назову повесьці ёсьць меншай у параўнаньні з патрэбай такога ж назову газэтнага артыкулу і хоць няраз добрыя повесьці, нават выбітных аўтараў, маюць назовы малай вартасьці, — аднак можна і трэба ад маладой яшчэ беларускай повесьці вымагаць, каб яна лёгкадушна да гэтай справы не адносілася, бо вымоўны франтавы назоў заўсёды прыдасца. Вось-жа назоў гэтай повесьці „Хлапец“ уважаю за не найгоршы, бо галоўнай у ей асобай усё-ж дыкі зьяўляецца бязсумліву хлапец Вінцук Паўловіч, а не Гануля, ці ксяндзы, і таму гэтыя назовы ня былі-б тут на мейсцы. Апрача гэтага наррацыя пачынаецца і канчаецца выразна на Вінцуку, а ўсе іншыя асобы настолькі маюць у гэтай повесьці апраўданьне свайго быту, насколькі адыгрываюць там меншую ці большую роль у Вінцуковым жыцьці.

Ці „Хлапец“ — гэта сапраўды повесьць? Так. Мае яна ў сабе ўсе аснаўныя складовыя элемэнты, якія, як гэта нават відаць з кожнага падручніка літаратуры, даюць падставу назваць яе повесьцяй. Аднак, з прычыны новасьці гэткага роду літаратуры сярод беларусаў у Польшчы, гдзе, паза спробамі М. Гарэцкага і Ст. Грынкевіча, нічога такога не спатыкаем, могбы, ясная рэч, аўтар назваць сваю дэбютовую працу неяк скрамней, напр.: нарысы, абразкі, ці як інакш. Магчыма, што крытыка тады ставіла-б Адважнаму менш вострыя вымаганьні, хоць сама рэч ўсёроўна асталася-б тым, чым яна сапраўды ёсьць, гэта знача — повесьцяй. Сяньня ўжо спрачацца аб родзе гэтага твору няма патрэбы. Як відаць з самага псэўдоніму, аўтару сьвяціла ў працы рымскае: „Sapere aude!“ *).

Адносіны маці ўдавы да свайго адзінага сына, а аўтара да галоўнай дзеючай асобы, ёсьць выбітна чуцьцявыя, аднак ня знача гэта яшчэ, што хлапца можна адразу ўважаць за Wunderkind. Ды-й ня мае права гэтак рабіць ані чытач, ані тымбольш крытык, бо кожны з іх можа праканацца, што хлапец

*) Мей адвагу быць мудрым! (прып. рэд.).

больш старанны, як здольны і што заўсёды астаецца дзіцём, міма крыху ранейшага, як у равесьнікаў, развою, што ўзноў не належа да так рэдкіх зьявішчаў, калі справа ідзе аб адзінага сына, які, зразумелая рэч, больш прабывае з маткай ці бацькам, як з таварышамі гульняў.

Фабула сусім няцікавая — кажа адзін крытык. Вось-жа знаў я і знаю людзей, якія не маглі дачытаць да канца „Боскай Камэдыі“ Дантэ, або адзначаных нагародай Нобля „Chłopów“ Рэймонта. Гэтак адноснымі ёсьць паняцьці: цікавае і няцікавае. Калі-ж ідзець аб повесьць, дык сапраўды, ці ня болш у ей знача *як* (id quo), чымся *што* (id quod). Праціўны для вока і смуродлівы сьметнік можа аднак быць адмаляваны на палатне памазком геніяльнага маляра сапраўды памастацку і малюнак гэны будзе творам мастацкім. З повесьцяй бывае так, як з прамовай, у якой аб уражаньні рашае—паводле нямецкага рэцэпту: Vortrag, Vortrag і яшчэ раз—Vortrag, што знача — спосаб, як яна была сказана. Ведама, вялікі пісьменьніцкі талент патрапіўбы фабулу „Хлапца“ змаляваць без параўнаньня больш памастацку, выкарыстаўшы ўсе, якія ў ей знаходзяцца, — Адважным-жа прапушчаныя — магчымасьці, збудаваўбы повесьць лепш архітэктонічна, стварыўбы плястычнейшую галерыю тыпаў, даўбы повесьці больш жывую і цікавую акцыю, цікавейшыя дыялёгі, далікатнейшыя паглыбленьні псыхолёгічныя, больш колерныя апісаньні прыроды і старраннейшую мову. Наш-жа Адважны толькі яшчэ дэбютуе ў повесьці, стаўляе першыя крокі, ня маючы бадай ніякіх родных папярэднікаў і ўзораў. І расейская літаратура мела раней Ламаносавых, а толькі пасьля Пушкіна. Няхай-бы хто з крытыкаў повесьці „Хлапца“ папрабаваў выступіць з уласнай, дык і яго праца была-б толькі пэўным этапам на дарозе натугаў, спробаў і нічым больш. Ніякаму народу лёгка ня прыходзяць яго шэдэўры. Патрэба доўгай, нарастаючай працы і да таго многіх калейна людзей.

А ці-ж вінаваціць нам Адважнага за тое, што ён у сваю повесьць увёў элемэнт нацыянальны і рэлігійны? Не забывайма, што ўся акцыя адбываецца ў першых гадох XX ст., калі ўжо ў нас бруняў беларускі рух, а рэлігія нашага сяла мела характар патрыархальны, дык як-жа мог-бы аўтар усё гэта ў повесьці памінуць, якой акцыя адбываецца выключна на сяле, ці — што тады было сусім тое самае — ў малым беларускім мястэчку? Ці мог маўчаць аб уніятах і аб іх падзеях? Нават камуністычны пісьменьнік ня могбы ў такой прадваеннай повесьці замаўчаць аб гэтым. А калі Адважны сусім не падаў у сваей повесьці колёрыту нацыянальнага, дык узноў спаткаў-бы яго закід з нацыяналістычнага лагеру, што не дацэньвае важнасьці гэтай праблемы, пашырае ў гэтай справе роўнадушнасьць або й проста нейкі рымскі космополітызм.

Нуднага маралізатарства ў аўтара повесьці бадай сусім няма, з выняткам таго выпадку, калі ён няміласэрна заўзяўся на курцоў.

З гумарам, а гэта такжа ня лёгкая рэч, удалося Адважнаму раз лепш, а другі раз горш. Сям-там ён занадта прымітыўны і наіўны. Памятаваць аднак трэба, што гэта повесьць мае сваей мэтай хутчэй адтварыць гумар народу, паколькі гэты знашоўся пад абсэрвацыяй аўтара, і такім, які ён ёсьць, чым стварыць нейкія самастойныя тыпы à la Заглоба, або жартаўлівыя „кавалкі", якія жылі б далей сілай творчай сугестыі пісьменьніка на чытача.

Акцыя ў повесьці „Хлапца" спачатку сапраўды крыху сонная і заўсёды занадта палітая сьлязьмі („безконечныя слёзы!"), у дальшым аднак цягу ажыўляецца і асягае ў канцы твору тэмп цалком нармальны. Мала інтрыгі, мала руху — можа нехта сказаць, хто хацеў-бы, каб повесьць чыталася лёгка і хутка. Вось-жа, хто чытае повесьць толькі каб заспакоіць даволі прымітыўную сваю цікавасьць, можа тут сапраўды дазнаць свайго роду расчараваньня. Трудна! Кожны пісьменьнік мае сваю пісьменьніцкую індывідуальнасьць і сваю мэтоду працы. Іншую Крашэўскі, іншую Арэшчыха і яшчэ іншую Кожэнёвскі (Conrad). De gustibus non est disputandum... Нават Сэрвантэс, Юго, Хашэк і інш. ужывалі няраз ліцэнцыяў і „трікаў", як наш Адважны, калі піша напр.: „Ну, але аб гэтым скажу другім разам"; дык і гэты закід хутчэй трэба залічыць да прычэпкі крытыкаў.

З пункту псыхолёгічнага повесьць вытрымана і, як на першую пробу, здаваляюча. Папяровых людзей аўтар сусім не паказаў. Усе тыпы — гэта жывыя асобы, добра падгледжаныя і адтвораныя, часамі з дакладнасьцяй люстра. Такой, ня іншай была прадваенная беларуская вёска ў нашым краю. Зналі мы гэткіх Гануляў і Тамашоў, а таксама Вінцукоў і яго таварышаў. Расейскія школы з іх вучыцелямі, клябаніі з ксяндзамі эндэкамі, беларусамі, літоўцамі, вясковыя расейскія ўстановы і інш. таксама адтварыў Адважны дасканальна і праўдзіва. Толькі чалавек, які не памятуе добра — або і сусім — часаў з прад 30—40 гадоў таму, толькі праваслаўны, які ніколі ў жыцьні ня быў у лацінскай клябаніі, у кватэры вікарага, арганістага, у касьцельным „шпіталі" і дзеля таго ня знае іх жыхароў, можа рызыкаваць проста недарэчнае цьверджаньне, што гэта ўсё тыпы... з фантазіі. Ахвотна згаджаюся, што Адважнаму горш удаліся тыпы благачыннага, сэмінарыстаў і дзяка, хоць і тут стараўся ён сьвятло і цень разлажыць роўнамерна і, як гэта відаць з усей повесьці, сусім не ідэалізуе духавенства каталіцкага, што сьцьвярджаецца на прыкладзе несымпатычнага ксяндза Марціноўскага.

Аднаго крытыка повесьці дужа так-жа зьдзівіла тое, што аўтар повесьці ўсю трагэдыю старога Марцука зьвёў быццам да... нястачы тытуну. Адкажу і на гэта: бываюць такія глядзельнікі ў тэатры, якіх прыводзіць да вясёласьці сцэна, калі шэкспіроўскі маўр Отэльлё, у найбольш патэтычным мамэнце ўспомненай трагэдыі таго-ж назову, у пачуцьці шалёнай зайздрасьці з прычыны падазрэньня ў нявернасьці сваей жонкі Дэсдэмоны,

дамагаецца... насаткі, якую яна згубіла, а якая мела быць доказам яе здрады. Тымчасам, як там тытун, так тут насатка не зьяўляюцца яшчэ галоўнай прычынай усей трагэдыі. Няма наіўных! Рэальнасьць яшчэ ня выключае таго, што, наперакор лацінскай пагаворцы, часта іменна мыш гару родзіць. Чытаў я нядаўна, што аўто, едучы праз афрыканскую пустыню, раптам затрымалася дзеля таго, што іголка ад грамафону, якую нехта вытрас на пясок, пракалола гумовае кола. Гэткім ёсьць жыцьцё і гэткія бываюць яго дзівосы.

Здалося так-жа некаторым крытыкам непраўдападобным тое, што разважная Ганулі няраз пыталася рады ў справе сына ў ворага школьнай асьветы старога Матусэвіча. Але-ж гэты закід адразу адпадае, як толькі мы сабе ўпрытомнім, што ўся справа дзеецца ў патрыархальнай сялянскай сям'і, дзе гутарлівыя старычкі ахвотна і многа гавораць дарэчы і адрэчы. Сяло так-жа мае сваіх рэзанэраў і дзівакоў.

Яшчэ дзіўней выглядае прэтэнсія крытыка, чаму слабы і хваравіты Вінцусь астаўся пры жыцьці, як-бы такі развой здарэньняў ужо згары быў непраўдападобны.

Моднай ёсьць сяньня „уплыволёгія" ці шуканьне ў кожным літаратурным творы чужых уплываў і залежнасьці ад чужых. Такім чымам лірычныя адступленьні Адважнага могуць быць насьледаваньнем Т. Гушчы, апісаньне расейскай школы — насьледаваньнем „Сызыфовых працаў" Жэромскага, зьверхняе прадстаўленьне жанчыны носіць на сабе ўплыў Каз. Сваяка.

Адчуваюцца ў повесьці ноткі аўтобіографічныя і спатыкаюцца рэальныя асобы, як біскуп высланы пад Урал (Зьвяровіч), рэктар віленскай сэмінарыі (Ушыла), кс. дзекан Кішкеліс (літовец кс. Бурба, што часам гаварыў беларускія казаньні) і інш.

Не бяз іроніі прабавала неспагадная крытыка падсунуць думку, як разьвязку ўжо паза граніцамі повесьці, што Вінцусь напэўна станецца ксяндзом, уступіць у партыю БХД і можа будзе лаіць беларускую санацыю... Вось-жа ў беларускім жыцьці хватае прыкладаў і адваротных: што Вінцусі траплялі спачатку ў Грамаду, а пасьля і ў Скарынію...

А як вышла ў повесьці Адважнага прырода? Некаторыя кажуць, што павярхоўна і слаба. Я так-жа далёкі ад захопленьня. Аднак у вымаганьні глыбіні і сілы трэба так-жа мець нейкую меру. Колькі-ж напрыклад лекцыяў мае апісаць аўтар, каб яго не спаткаў закід павярхоўнасьці пры адтварэньні расейскай пачаткавай і гарадзкой школы?! Ці ж повесьць толькі тады дасьць дакладнае апісаньне беларускага мястэчка ў нас, калі аўтар намалюе ў ей адначасна сыльвэты: ксяндза, бацюшкі, рабіна, настаўніка, лекара, вэтэрынара, аптэкара, фэльчэра і г.д., нікога ня мінаючы?! Геніяльная якая повесьць можа і змагла-б даць іменна такі абраз, такую візію мейсца і людзей, але не пачынаючы пісьменьнік, які яшчэ як-бы вучыцца пісьменьніцкага рамясла.

Закіды дыдактызму і тэндэнцыі былі больш актуальнымі прад вайной, а сяньня яны ўжо сталіся звычайным анахронізмам, бо дыдактызм і тэндэнцыя, хоць троха ў адменнай форме, уліліся сяньня магутным руч'ём у сусьветную літаратуру і знайшлі многа староньнікаў, як справа (фашызм), так і злева (камунізм). Гдзе-ж сяньня літаратура вольная ад дыдактызму і тэндэнцыі?! Дарэмна мы шукалі-б яе.

Апісаньні прыроды ў Адважнага сапраўды маглі-б быць лепшыя, стараньнейшыя і больш выканчаныя. Аднак недахопу адчуцьця і прыязьні з красой прыроды Беларусі я не адважыўся-б яму закінуць. Аўтар разумее яе пасвойму і любіць сапраўды, але, як той земляроб, не забаўляецца ў захопленьні і ў апісаньні. Прырода з усей сваей красой, гэта нешта так для яго зразумелае, што шкода яму слоў на гэта траціць.

Душы беларускага земляроба даволі нявыказаных скарочаньняў яго ўнутраных перажываньняў. Апісаньняў прыроды даў Адважны ў сваей повесьці сусім даволі, іншая толькі рэч, што яны маюць няраз характар іменна гэтых скарочаньняў. Смакуны літаратуры і дэкляматары, зразумелая рэч, ня будуць з іх здаволены.

Мова Адважнага мала мае ў сабе поэзіі і ня носіць на сабе сьлядоў большай мастацкай абробкі. Некаторыя вобразныя звароты, як анёла мэханіка, віленскага каралевіча (сьв. Казімера) і інш. зьвіняць даволі дзівосна.

Часамі здараюцца непатрэбныя і дражнячыя паўтараньні прозьвішчаў (бабскі стараста, Бугава і інш.). Спатыкаюцца так-жа выражэньні чужыя, як квадратура, распаложаны і інш.

Урэшце некаторыя сытуацыі ў повесьці выглядаюць непраўдападобнымі: тлумачэньне вершаў і баек ксяндзом Галузам падчас разьвітаньня з моладзяй, высыланьне тэлеграмы так-жа ксяндзом і сьвяшчэньнікам да губэрнатара, сумнівы ксяндза Марціноўскага, ці вольна хаваць таго чалавека, што прыпадкам утануў, спатыканьне бацькі свайго адным папай з рэлігійнай працэсіяй...

Канчаючы гэтыя ўвагі для характэрыстыкі Адважнага, як аўтара повесьці, скарыстаю з наступнага параўнаньня: Вінцук Адважны сяньня яшчэ гэта пачаткавуючы фотограф - аматар, які здраджае даволі прыгожыя мастацкія магчымасьці. Дык няхай застасуе ў сваей працы новую тэхніку, як зрабіў гэта Ян Булгак у фотографіцы, а тады зможа стацца праўдзівым мастакомпісьменьнікам повесьці.

Гэтага сардэчна яму жадаю.

Др. Ст. ГРЫНКЕВІЧ

Паны „Жолондзі"

У мінулым годзе паявілася ў Вільні у польскай мове повесьць пад назоваю „Zwycięstwo Żołądzia". Варта над ею крыху спыніцца. Кніжка гэтая між іншым была нагароджана віленскім Таварыствам Філёматаў і агулам выклікала даволі жывую дыскусію, рэха якой пайшло даволі далёка за Вільню. Цікавая гэта кніжка і з беларускага боку гледжаньня. Зьмест коратка повесьці гэтае такі. На тэрыторыі беларускай працуе адна са шматлікіх арганізацыяў, якая завецца Стражаю. Мэта арганізацыі падрыхтаваць кадры будучых змагароў за цэласьць граніцаў польскіх на ўсходзе. Камэндантам Стражы ў адным з паветаў зьяўляецца нейкі Жолондзь, адзін з культуртрэгераў, наехаўшых пашыраць культуру да нас з Галіччыны. У свабодных часінах паміж папойкамі, рамансамі з вучыцелькамі, паненкамі з маёнткаў, займаецца ён замацоўваньнем польскасьці сярод гушчаў сялянскіх. У вадным з аддзелаў арганізацыі паявіўся бальшавіцкі дух. Павадыр гэнае работы бальшавіцкае ўцякае з некалькімі са сваіх спагаднікаў у лес. Стараста, паліцыя, ня маючы даверу сярод насельніцтва і адначасна дзякуючы таму, што паліцыя ўся чужая, якая ня ведае зусім тэрыторыі, дзе хаваюцца гэныя бальшавікі, ня ўмеюць правесьці ліквідацыі гэнае жменькі людзей. Жолондзь выкарыстаў сытуацыю, каб падчыркнуць патрэбу свае арганізацыі, амаль што не правакуе аружны напад гэных бальшавікоў на маёнтак буйнага землеўласьніка і зьяўляецца ў апошні мамэнт, ратуючы старасту і ўсіх гасьцей ад нападу. Дзякуючы гэтаму, забываюцца аб „недалікатных" адносінах Жолондзя да арганізацыйных грошаў. Жолондзь выходзіць героем, у нагароду ён, здаецца, ажэніцца з паненкаю, дачкой землеўласьніка і будзе далей больш радыкальна працаваць над замацаваньнем усходніх граніцаў польскае дзяржавы.

У повесьці, як у крывым люстры, можна бачыць польскую адміністрацыю, грамадзкіх працаўнікоў польскіх арганізацыяў. Гэта ўсё да пэўнае меры рэвэляцыі і можам верыць аўтарцы на слова, што яна лепш за нас ведае ўсе ўзаемаадносіны ў сфэрах землеўласьнікаў, польскага настаўніцтва, урадоўцаў, старества, паліцыі і г. д. Пакінем зусім на старане тое, што аўтарка піша аб нашым народзе. Народу гэтага яна ня ведае, як ня ведае ягонае мовы, не разумее абычаяў, душы народнае. Цікаўна адзначыць мо' толькі, што ў повесьці праводзіцца думка, што беларус і сяньня такі пацыфіст, так баіцца крыві, што гатоў на'т выдаць сваіх сяброў у рукі паліцыі, каб толькі суседу ягонаму, хаця ён і пан-абшарнік, як кажуць — волас ня спаў з галавы. Дужа сумлеваюся, ці такая адрысоўка характару беларуса правільная.

За тое, як кажу, паверым на слова аўтарцы, што ўсенька тое, што яна кажа аб сваіх людзях — гэта сапраўднасьць. Пачнем ад старасты. Гэта тутэйшы землеўласьнік, якога няведама дзеля чаго трымаюць пакульшто на пасадзе. Чалавек гэны ў повесьці некалькі разоў трымае тэлефон у руках, курачы пры гэтым шмат папяросаў. Іншым разам ён іграе ў карты, іншым разам з агідаю адварочваецца ад Улькі, жонкі аднаго з сяброў Стражы, які падпаў пад уплывы бальшавіцкія і якога за гэта пасадзілі ў вязьніцу. Жонка, між іншым, у цяжку, праўдамі і няпраўдамі стараецца адведаць мужа і вось нараілі ёй зьвярнуцца да старасты. Стараста, гледзячы з агідаю на яе, пачуўшы, хто яна такая, уцякае. Бачым некалькі разоў гэнага старасту ў гутарках з Волловічам, старшынёю Стражы, на тэму Жолондзя.

Ня выходзячы са Староства, знаёмімся яшчэ з Огуркевічам, рэфэрэнтам бясьпечнасьці. Гэта чалавек з Галіччыны. Ня ўмее ён аніяк схапіць настрою душы селяніна беларускага. Калі-ж нешта ад яго і пачуем, дык гэта будуць такія словы: ...„яны ўсе аднолькавыя (значыцца сяляне)... я-б з іх скуру дзёр... праваслаўнае гэта, чужое, паганае...“ У іншым месцы зноў ён не шкадуе моцных словаў, каб адмаляваць аутохтонаў... „дзікарства і дурнота, што валасы на галаве падымаюцца“. Зразумела, што лінія ягонае палітыкі даволі простая. Калі нехта пытаецца ў яго, як ён са сваімі паглядамі можа дагаварыцца з народам, дык ён адказвае: „я-ж і не хачу з ім дагаварывацца, а хачу іх толькі акелзаць“. Што азначае „акелзаць“ у рэфэрэнта бясьпечнасьці, ведаем даволі добра, дык і паясьняць ня трэба.

Паглянем на іншых урадоўцаў, у гэным Старастве. Вельмі часта гэныя людзі „ждуць“. Ждуць, каб хутчэй трэцяя, канец іх працы. Каб ня надта доўжылася, адведываюць карчму жыдка Ротмана, таму, што яна пасуседзку. Огуркевіч дык прынамся ведае меру. Ён афіцыяльна ўпарадку, пап'яному не зьяўляецца ў Старастве. Другі важны рэфэрэнт, дык хістаючыся на нагах, прыходзіць каля трэцяе пачынаць працу. Кумпанія, калі яна часамі і вясёлая, дык казаць ня можна, каб была сымпатычная, ці прынамся салідная.

Прадстаўнікі абшарнікаў, якіх даволі шмат выводзіць аўтарка, розныя па масьці. Ёсьць такі Волловіч, старшыня Стражы, арганізацыі, якая мае ў сфэрах абшарнікаў фірму, напалову бальшавіцкай. Ня ведаем, што загнала Волловіча да старшынства. Чалавек ён даволі асабіста сымпатычны, розумам не далёкі, усёж-такі ня п'е, грашэй не раскідае на лішнія роскашы. Ня бачым яго нідзе ў рэальнай рабоце, так што яно даволі цяжкавата сказаць, якім ён быў-бы ў адносінах да людзей жывых.

Усе іншыя землеўласьнікі аджыўшыя людзі. Умеюць адно толькі — стагнаць на падаткі, што іх Варшава ня хоча падтрымліваць, што хутка скончыцца іхняя эра, што і зямлю ў іх адбяруць, як яны кажуць „галіцыякі“, а што там крыху астанецца,

дык і тое аддадуць сялянам беларускім, каб прысвоіць іх да польшчыны. Хаця яны ўсе яшчэ жывуць, аднак, можна сказаць аб іх, што яны людзі „быўшыя“. Ня маюць яны нічога сказаць, ня ўмеюць нічога рабіць. Маюць культуру, толькі і тае культуры ня ўмеюць ніяк выкарыстаць, яна ў іх баласт. На'т і маладзейшыя з іх ня ўмеюць быць добрымі працаўнікамі, калі і лучаюць на пасаду, дзякуючы знаёмасьцям са старастаю і г. д.

Жонкі абшарнікаў, агулам жанчыны гэнае сфэры, выходзяць даволі бледна. Некаторыя традыцыйна ўмеюць добра варыць, ці на'т лепш сказаць — пячы. Бяда, што найчасьцей ня маюць з чаго, дык нічога не астаецца ім, як плёткі рабіць. Маладыя з іх, як маладыя, і да таго памоднаму ўзгадованыя, ловяць жыцьцё, кахаюцца.

Побач пана абшарніка, у повесьці польскай бачым, ды ня толькі ў повесьці, але і ў нашай практыцы жыцьцёвай, ксяндза. Ёсьць ён тутака. Ксёндз дзекан зусім традыцыйны. Старэнькі, ахвотнік добра зьесьці і выпіць. Больш аб ём нічога ня можна сказаць.

Ёсьць і настаўнік, ці лепш настаўніца. Бедная дзяўчына, нейкая замораная, ня мае на'т прызваітага абутку на нагах. Вучыць дзяцей чытаць і пісаць, пакідае іх у пару вучобы на... гадзінку, кабісьці пакахацца з Жолондзем.

Маркотнасьць нейкая абхоплівае чалавека, гледлячы на гэных людзей і міжвольна накідываецца думка, дзе-ж тая пружына, на якой трымаецца ўсё жыцьцё польскае сапраўднасьці сярод беларускага насельніцтва? Бязумоўна, што ёсьць паліцыя, аб ёй часта гаворыцца ў повесьці, выступае яна на сцэну, аднак як орган выканаўчы. Ня відаць за тое ў сфэрах, аб якіх была дагэтуль гутарка, ніякае ідэолёгіі, ніякае думкі, якая магла-б апраўдаць існаваньне такога грамадзянства.

Ёсьць той элемэнт, які паводле аўтаркі рыхтуе будучыну польскую, які зьяўляецца найбольш бадзёрым, да якога бязумоўна належыць гэнае заўтра. Элемэнт бадзёрасьці, элемэнт заўтра ўяўляе Жолондзь, цэнтральная асоба повесьці. Цікава будзе прыглядзецца да гэтага чалавека Гаворыць ён сам аб сабе шмат. Гавораць аб ім іншыя асобы, гаворыць аб ім тое, што ён робіць. Аб мінуўшчыне героя ведаем мала. Малым хлапцом уцёк ён з хаты і пашоў ваяваць. Бадзяўся па розных фронтах. Сын шаўца, да якога неахвотна прызнаецца, кончыў 6 клясаў гімназіі і вось ён адказны грамадзкі працаўнік. На ім трымаецца акцыя Стражы. Калі старшыня Стражы хоча яго выкінуць за кражу грамадзкіх грошаў, дык стараста бароніць, кажучы, што такіх працаўнікоў мала дзе можна сустрэнуць.

Жолондзь, камэндант Стражы, едзе на паседжаньне ўраду аднаго з аддзелаў і думае: „ці надта доўгія і скучныя будуць нарады і ці сапраўды прыедзе Зоня“ (Зоня — гэта дачка старшыні Стражы). Да Зоні ён узяўся вельмі шчыра. Яна не падабаецца яму зусім. За тое яна дачка і спадкаберніца Волловіча. Бацька

ейны мае маёнтак, на які мае вялікую ахвоту сам Жолондзь. А вось што сам аб сабе кажа гэны герой: „ах, каб мець іх усіх (жанчын) на кожны кліч! кожную іншую, патрэбную думкам, сэрцу, крыві! Каб мець шмат грошаў, каб раскідаць іх прыгоршчамі, бяз думкі аб заўтрашні дзень! Каб мець грамадзкую чэсьць такую вялікую, каб ніхто ня сьмеў прыступіцца з крытыкаю. Каб таптаць нагамі масы...“

І гэны вось панок на сходках Стражы навучае аб працы на карысьць дзяржавы, агулам польшчыны. Рэзультаты працы такіх людзей — загадзя можна казаць — будуць надта сумніўныя. Няма на грош веры, шчырасьці, усё, што гаворыць такі чалавек — гэта пустаслоўе. Нядзіўна таму, калі пачуем на паседжаньні ўраду аддзелу Стражы пры абгаворываньні справы большае актывізацыі працы: — „ніколі ня можна дачакацца, каб яны (сяляне) плацілі за прадстаўленьне, добра што дарма прыходзяць!“... Бачым у Стражы элемэнт, які цікуе на карысьць з арганізацыі пры падатках, цікуе на палёгкі пры адбыўцы службы вайсковае і г. д.

Сумныя рэфлексыі агортываюць чалавека, глянуўшы на такую галерыю тыпаў. Хто-ж тады трымае ў сваіх руках нашага селяніна?

Выглядае з повесьці, што паны Жолондзі зусім бяскарна гаспадараць ня толькі над нашымі грашмі, што ідуць у падатках, ці розных ахвярах, яны-ж адначасна трымаюць, прынамся фармальна, уладу над душамі нашае моладзі, заганяючы яе ў свае арганізацыі, рыхтуючы яе да будучага жыцьця!

Наканец адна заўвага: добра, што гэнае крывое люстра нашае сапраўднасьці ўзяла ў рукі аўтарка з прозьвішчам Добачэвска, інакш гэнае сапраўднасьці ніколі мы і не пабачылі-б з тае прычыны, што ў беларускай вопратцы не прапусьціла-б яе цэнзура.

Мгр. С. АЛЕНЬЧУК

Крытычныя ўвагі

да артыкулу „Цені і Блескі“ Ад. Станкевіча ў 4-ай кніжцы „Калосься“ 1935 г. *)

Пытаньні, высоўваныя ў вышэй успамянутым артыкуле Ад. Станкевіча, заслугоўваюць на ўвагу нашай народнай інтэлігенцыі, як і наагул усей грамадзкай думкі.

*) Трымаючыся прынцыпу audiatur et altera pars, друкуем артыкул гр. м-гра Аленьчука, у якім ён, як чытачы пераканаюцца, з гледзішча дыялектычнага матар'ялізму, у сувязі з артыкулам нашага рэдакцыйнага сябры, асьвятляе пытаньні культуры і лёзунгу „Культура — нацыянальная формай, соцыялістычная зьместам“. Рэдакцыя.

Жывём у часы, калі пытаньні культуры і яе кірунку разьвіцьця — зьяўляюцца як ніколі пробным камянём усяго камплексу соцыяльна-політычных зьявішчаў у сучасным грамадзкім жыцьці.

Гаворучы гэта мы маем на ўвазе, паўтараем, нашую ўласную інтэлігенцыю, якая ўжо даўно выйшла з дзіцячага веку абмяжованасьці ў граніцах самабытнасьці, замкнутасьці ў сабе. Вялікія хвалі бурнага жыцьця б'юцца і аб нашыя берагі і наш правільны пагляд на праблему культуры зьяўляецца прадумовай для развою нашага культурнага жыцьця.

Ад. Станкевіч, праўда, сьцьвярджае факт, што сяньнешняя зах.-эўропэйская культура, апёртая пераважна на філёзофічным ідэалізьме, перажывае крызыс, аднак, крытыкуючы новую культуру, што сяньня творыцца на падставах філёзофічнага матар'ялізму, робіць, здаецца, паварот узноў у бок таго-ж ідэалізму.

Вось-жа калі ідэалістычная філёзофія зьяўляецца ў руках Ад. Станкевіча тым ліхтаром, які мае выявіць цені ў новай чалавечай культуры, якая сяньня будуецца на філёзофіі дыялектычнага матар'ялізму, скажам прадусім некалькі слоў аб аднэй і другой філёзофіі, бо паводле нас прадстаўляе ён іх ня сусім верна, а нават і памылкова. Паводле Ад. Станкевіча выходзіць, што матар'ялізм „апрача матэрыі на сьвеце ня бачыць нічога". Гэта проста няпраўда. Марксіцкі матар'ялізм разьвіўся і акрэп іменна ў барацьбе супроць гэткага вульгарнага матар'ялізму. „Галоўны недахоп папярэдняга матар'ялізму — уключаючы і фэербахаўскі — заключаецца ў тым, што прадмет, сапраўднасьць, пачуцьцёвасьць бярэцца толькі ў форме а б'е к т а, ці ў форме с у з і р а н ь н я, а не як ч а л а в е ч а я п а ч у ц ь ц ё в а я д з е й н а с ь ц ь, п р а к т ы к а, не суб'ектыўна". (Энгельс, „Тэзысы аб Фэербаху"). Досыць успомніць хоцьбы барацьбу Маркса і Энгельса супроць францускіх матар'ялістаў. А ўжо навука Маркса самым рэзкім чынам змагалася супроць мэханістаў і ўсякіх іншых вульгарызатараў філёзофіі дыялектычнага матар'ялізму (гл. Леніна „Матэр'ялізм і эмпірокрытыцызм"). У сапраўднасьці дыялектычны матар'ялізм апрача матэрыі бачыць таксама ідэі і пачуцці, што называюць дух. Монізм гэтай філёзофіі ня ў тым, што яна не прызнае нічога апрача матэрыі, а ў тым, што прызнае ўсе духовыя зьявішчы, якія вынікаюць з матэрыі, як рэзультат матар'яльнага існаваньня.

Як бачым — гэта сусім ня тое, за што выдае матар'ялізм Ад. Станкевіч.

Нязгодным з праўдай зьяўляецца такжа тлумачэньне Ад. Станкевіча сутнасьці ідэалізму, якая быццам зьяўляецца ў тым, што ён (ідэалізм) „апрача матэрыі прызнае на сьвеце сілы духовыя". Справа ў тым, што галоўнай рысай ідэалістычнай філёзофіі зьяўляецца прызнаньне самастойнага, унезалежненага ад матэрыі, існаваньня духа, а пэўныя разнавіднасьці гэтай філёзофіі, наагул нічога ня бачаць апрача духа (соліпсысты—Бэрклі, Авенарыус, Мах), або галоўнае значэньне духа ў нашым існаваньні

(Дэкартаўскае „Cogito ergo sum“). Дуалізм гэтай філёзофіі іменна ў гэтым, што яна бачыць матэрыю і дух, як паасобныя зьявішчы.

Мы лічылі неабходным зрабіць гэтыя заўвагі таму, што пры дапамозе неправідловага тлумачэньня сутнасьці двух кірункаў філёзофіі і галоўным чынам пры дапамозе папулярызацыі не адпавядаючай сапраўднай сутнасьці матар'ялізму, аўтар будуе далейшыя, ужо сусім актуальныя вывады аб „ценях і блесках“ новай чалавечай культуры.

Будучы ў палоне ідэалістычнай філёзофіі, крызыс якой сам яе абаронца прызнае, Ад. Станкевіч праз яе прызму падглядае (іменна падглядае, а не аналізуе) тыя працэсы, якія адбываюцца ў жывым, творчым арганізьме новай чалавечай культуры.

* * *

Ёсьць такая хвароба, якая палягае на тым, што чалавек перастае адрожніваць колеры: — чырвонае здаецца яму зялёным — і наадварот. Ад. Станкевіч, паводле нашай думкі, церпіць на, свайго роду, соцыяльны дальтанізм. Праменьні новай чалавечай культуры дапамаглі нават у крызыснай Заходняй Эўропе вырасьці вялікаму руху супроць барбарызму — у абарону культуры — а Ад. Станкевіч не праменьні бачыць, а цені. Гэта новая чалавечая культура, паводле Ад. Станкевіча, і аднабокая і выключае быццам „элемэнт нацыянальны, выключае паняцьце народу, як грамадзкай групы“ і тое, што гэта культура анэмічная, бедная і што яна „спыняе этычнае разьвіцьцё чалавека, грамадзкіх груп народу“ і што яна даводзіць да грубага утылітарызму — адным словам: гэта ўжо ня цені, а поўнае зацьменьне...

І ўсё гэта толькі выключна таму, што новая культура ня носіць на сабе „адбіцьця ідэалістычнай ідэолёгіі“ — ідэолёгіі, якая асабліва пануе ўва ўсіх краінах перамогі культурнага вандалізму.

Тымчасам з гэтым усім справа выглядае інакш.

Культура новай чалавечай грамадзкасьці абапёрта на матар'ялістычнай філёзофіі, якая ўсе зьявішчы духовага парадку разглядае ў іх залежнасьці (не мэханічнай, а дыялектычнай) ад матар'ялістычнага сьвету. У нутры старога грамадзтва ўва ўсім сьвеце паступовая частка людзкасьці тварыла і творыць сваю міжнародную культуру, якую даўно прыгатавалі „прапаведнікі свабоды і ворагі насільля“. Гэта зелянеючая рунь сапраўднай культуры поступу людзкасьці, скутая ледзяной карой рэакцыі старога ладу, з новай вясной народаў дала нябывалы ў гісторыі колькасны і якасны ўзрост, адгортваючы новую старонку ў гісторыі сусьветнай культуры. Грунтоўныя зьмены, якія зайшлі ў адносінах паміж чалавекам і чалавекам, а таксама чалавекам і прыродай унясьлі адпаведныя зьмены ў псыхіку людзей у галіне іх духовай творчасьці. Грамадзкасьць, якая сваімі ўласнымі рукамі да караня перабудавала ўсё сваё жыцьцё, ставячы сабе за мэту

дайсьці да стану социяльна-эканамічнай роўнасьці людзей, незалежна ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасьці, сваю культурную творчасьць, вырасшую на гэтым грунце, скіравала ў гэтым самым кірунку. Старому сьвету нацыянальнага ўціску, нацыянальнай грызьні, нацыянальнага сэпаратызму, творцы новай культуры процістаўілі новы сьвет еднасьці працоўнага народу ўсіх нацыяў, сьвет, у якім няма мейсца ніякім прывілеям для ўціску чалавека над чалавекам. Вось гэтаму культурна-творчаму працэсу адпавядае яе кліч — „культура нацыянальная формай, соцыялістычная зьместам“ — як непарушная запарука сапраўднай паступовай культуры людзкасьці. Што азначае гэты кліч? Ён азначае, што працэс культурнае творчасьці не зьяўляецца самастойным, адарваным ад эканамічна-культурных умоваў існаваньня грамадзкіх клясаў, якія яе твораць. Гэтыя умовы: нацыянальнае асяродзьдзе данай грамады і соцыяльныя варункі. Прычым гэтыя ўмовы не пярэчаць адна другой, а наадварот — дапаўняюць сябе і твораць еднасьць формы і зьместу.

Нацыянальнае асяродзьдзе ў варунках, калі ніякія нацыянальныя агранічэньні і прыгнёт ня існуюць, ствараюць спэцыфічную форму культуры (мова, прыродны псыхічны склад), прычым усё лепшае, не консэрватыўнае, з цэннасьцяў мінуўшчыны, адпавядаючае творчаму духу новай эпохі становіцца арганічнай часткай сучаснай культуры.

Соцыяльныя ўмовы, у варунках соцыяльнага вызваленьня, нічым ня розьняцца для беларуса, як і для рускага, ці ўкраінца. Крыніца іх творчасьці ёсьць адна — гэта радаснае, шчасьлівае жыцьцё, сьвядомае сваіх імкненьняў і пэўнасьць іх дасягненьня — пэўнасьць дайсьці да соцыялістычнай грамадзкасьці. Гэта і ёсьць соцыялістычны зьмест новай культуры. Каб гэта яшчэ ясьней выглядала, дамо аскравы прыклад. У тэй-жа кніжцы „Калосься“ надрукаваны некалькі вершаў нашага клясыка народнага паэта Янкі Купалы.

Наш пясьняр пяе аб нашым беларускім лёне:

„Ой лянок, лянок мой чысты,
валакністы, залацісты“...

Прыпеў—клясыка народу—беларускі, прыпамінаючы лепшы фольклёр. І ня толькі прыпеў—увесь верш формай такі народна-беларускі, што проста не ўяўляю сабе, як-бы ён выглядаў у тлумачэньні на іншую мову, без таго, каб не затраціў гэтай беларускай спэцыфічнасьці.

Аднак — прачытаеш тэты верш і чуеш: гэта нешта новае, няведамае старой беларускай літаратуры. Тут справа ўжо пра зьмест, які ў народнай форме дасканальна ўлажыўся. Гэта зьмест аб радасьці — пэўнай беларускай дзяўчыны з прычыны залацістага лёну — грамадзкага дабра, з прычыны вялікага каханьня да свайго брыгадзіра, з прычыны пэрспэктывы блізкага сумеснага шчасьлівага жыцьця. Прадставім сабе на хвіліну, як-бы

ў буржуазнай краіне аб гэтым лёне запяялі? Ці-ж ня вырас-бы адразу перад нашымі вачамі... падаткавы экзэкутар!

Ці возьмем наступны верш аб Алесі, пра каторую „кукавала зязюля... гадавала матуля“, што вырасьце дзяўчына гэтак, як расьлі дзяўчаты за дзеда і прадзеда, а Алеся—

...„паляцела дзяўчына
Самалётам гонкім
Над шчасьлівай краінай,
Над роднай старонкай”...

Вось і клясычны ўзор народнага беларускага вершу з новым соцыялістычным зьместам. Гэты палёт беларускай дзяўчыны „над шчасьлівай краінай“ вырастае да ўзроўня сымболю кірунку і разьвіцьця беларускай культуры. І супроць гэтай культуры пусьціўся ў паход з „тэлескопам“ ідэалістычна крызыснай ідэалёгіі Ад. Станкевіч, каб знайсьці цені.

Дык дзе-ж тыя цені?

Ад. Станкевіч піша: „...як бачым з гэтага лёзунгу („Культура—нацыянальная формай, соцыялістычная зьместам“) культуры пастаўлены даволі вузкія рамкі“.

Каб устанавіць, ці культуры пастаўлены „вузкія рамкі“, трэба параўнаць яе з іншай культурай, якой такіх рамак, паводле Ад. Станкевіча, не ўстаноўлена. Вось маем перад сабой культуру, якая служыць хіба прыхільнікам ідэалістычнага сьветапагляду, як прыклад, — культуру краіны філёзофаў і паэтаў, вынаходнікаў вышэйшай тэхнікі — Нямеччыны. У якім стане яна знаходзіцца? Ці шырокія яе рамкі разьвіцьця? Што сталася з гэтымі паэтамі і філёзофамі? Варта толькі гэта параўнаньне паставіць — і перад аб'ектыўным чытачом выплывае вобраз шырыні гэтых рамак. Замест культуры — культ чалавека-бэстыі, культ *не*навісьці да іншых randomродаў (і да нашага беларускага ў тым ліку) толькі таму, што ня маюць нордыцкай крыві.

Скажуць: выбралі вы дрэннае параўнаньне—„цывілізацыю“ фашызма. Але-ж гэта „цывілізацыя“ абыймае сваім уплывам аграмадныя часткі Эўропы. Фашыстоўскія рамкі сягаюць і культуры такіх краін, дзе фашызм не зьяўляецца пануючым. Досыць запазнацца з навукай гэткіх філёзофаў з „неагранічанай“ культуры, як Шпэнглер і інш., каб дагледзець гэту варожую дэгэнэрацыю панаваньня спірытуалізму замест навукі. Вось і рамкі гэтай навукі. Ці возьмем г. зв. „дакладную навуку“. Так, „працьвітае“ яна, але ў адным толькі кірунку: прыгатаўленьне сродкаў зьнішчэньня людзькасьці, сродкаў вайны. Паза гэтым пануе страшэнная цемра і хаос. Гэта і ёсьць яе рамкі.

А цяпер — дзе-ж тыя рамкі агранічваючыя ўзрост новай культуры? Іх не дагледзіш, як ня ўбачыш берагу з сярэдзіны мора. Гэтыя рамкі — гэта граніца дасягаемасьці сучаснай чалавечай думкі ўва ўсіх кірунках навукі — г. зн. гуманістычнай і дакладнай. Вялікае разьвіцьцё сваё новая культура, апрача палітычна-соцыяльных пры-

чынаў, заўдзячае таксама і таму, што яе шлях асьвятляе адзіны сапраўдна-навуковы мэтад — матарыялістычны.

Ад. Станкевіч сярод „ценяў“ разглядзеў, што новая культура „выключае элемэнт нацыянальны, выключае паняцьце народу, як грамадзкай групы, сьведамай сваей асобай нацыянальнасьці“.

Ужо той факт, што лёзунг „культура — нацыянальная формай, соцыялістычная зьместам“ зьяўляецца арганічнай еднасьцю двух элемэнтаў, гаворыць аб тым, што няма праўды ў гэтым цьверджаньні аб выключэньні нацыянальных элемэнтаў. А што сказаць ужо аб тым, што новая культура быццам „выключае паняцьце народу“, у той час, калі іменна марксізм і яго клясыкі, навукова і ўсебакова разглядзелі нацыянальную праблему, — навукова акрэсьлілі паняцьце нацыі і шлях і рашэньні нацыянальнай праблемы. Можна гэта сьцьвердзіць, маючы прад сабой прыклад адраджэньня народаў, як нацый, нават у выпадках, калі пры капіталізьме яны гэтым ня былі.

Але ці існуе нацыя як цэлае, як монолітнасьць? У кожнай нацыі ёсьць дзьве нацыі. У кожнай нацыянальнай культуры існуюць—хаця і не разьвітыя—зародкі дэмократычнай і соцыялістычнай культуры, таму, што ў кожнай нацыі існуе працоўная і эксплёатаваная маса, абставіны жыцьця якой ствараюць абавязкава дэмократычную і соцыялістычную ідэолёгію. Але ў кожнай нацыі ёсьць таксама буржуазная культура, пры чым яна не знаходзіцца ў становішчы зародкаў, а зьяўляецца пануючай культурай, адпаведна пануючай клясе.

Адно толькі тут зьяўляецца праўдай, што ў кожнай нацыі „поруч з убогімі людзкімі будынкамі уперліся ў неба высокія палацы, поруч з галітою ходзіць роскаш і багацьце, разам з людзкімі сьлязамі льюцца вясёлыя галасы песень, грыміць музыка з раскошнага саду“ (Як. Колас).

У чым-жа „вузкія рамкі“, аднабокасьць?

Ці ў тым, што да творчага працэсу міліённых масаў не дапусьцілі прапаведнікаў старой культуры і гэтым парушылі шырыню нацыянальных рамак і нацыянальнай усебаковасьці? Але Ад. Станкевічу, як хрысьціяніну, даўна вядома прыповесьць аб пшаніцы і плевах. Там, дзе расьце пшаніца новай чалавечай культуры — не павінна быць мейсца плевам, старой нацыяналістычнай культуры, як культуры буржуазіі.

А што-ж сказаць аб гэткім аргуманце, як „анэмічнасьць і бледнасьць“ новай культуры? Ці-ж толькі тое, што цьвердзіў Спіноза аб квадраце, які ў выпадку, калі-бы ён меў дар слова, сказаў-бы, што ўвесь сьвет... квадратны. Як можна гаварыць аб анэмічнасьці культуры, у якой прыймаюць удзел тысячы — міліёны, якая прамянее над усім сьветам і запладняе думкі ўсіх, хто бачыць асуджонасьць „бязрамачнай“ навукі?

Ці-ж можна параўнаць гэтую „анэмічную“ культуру з „поўнакроўнай“, не абмяжованай вялікімі рамкамі хаця-бы ў галіне літаратуры? Чым-жа можна запярэчыць Радку, які кажа: Сотні тысяч расейскіх капіталістаў, абшарнікаў, урадоўцаў, афіцэраў, пісьменьнікаў змытых хвалямі рэволюцыі з роднай зямлі, раскіданых па ўсім сьвеце, ня здолелі на працягу 15 год даць аніводнае повесьці, аніводнае драмы, аніводнага зборнічку поэзіі, якія-бы да глыбіны ўстрасянулі людзкой душой, якія-бы расказалі сьвету, прынамсі тым, хто дорыць іх сапраўднай сымпатыяй, аб тым, што перажыла, перанесла, перадумала расейская эміграцыя. Праўдападобна, што за сто год гісторык, пішучы аб іх, успомніць аб узварушваючай песьні, поэта кабарэтаў, Вярцінскага „Сумасшедший шарманщик“.

Вось што сучасная расейская эміграцыя здолела „уратаваць“ са спадчыны Пушкіна, Гогаля, Талстога. (Партрэты і памфлеты. Том II. Варшава 1936 г.).

„Яна (гэта новая культура) спыняе этычнае разьвіцьцё чалавека, грамадзкіх груп народу... этычнае пачуцьцё зводзіць да трубага утылітарызму“.

Гэта ўсё — пра культуру, дзе галоўным лёзунгам стаў новы гуманітарызм, чуткасьць да чалавека, да яго патрэбаў — духовых і матар'яльных.

У новай культуры пачалася і новая эра новай этыкі, вышэйшы закон якой зьяўляецца д а б р о г р а м а д з к а с ь ц і, д а б р о ў с і х п р а ц о ў н ы х, салідарнасьць з усімі, якія імкнуцца да лепшага жыцьця.

Гэта этыка, абапёртая на грунце зьмяніўшыхся соцыяльных адносінаў, на грунце зьнішчэньня грамадзкіх паразітаў, перавыхоўвае чалавека, выкарчоўвае гэты грубы, эгоістычны нарост — пазасталасьць часоў капіталізму. Імпэратыўным наказам гэтай этыкі зьяўляецца — ўсе сілы у карысьць працоўных братоў — усёроўна, да якой нацыі ці расы належаць, усёроўна, на якім пункце зямной кулі жывуць.

Але будзьма справядлівымі, пісаў-жа Ад. Станкевіч ня толькі аб ценях, але так-жа і аб блесках.

Ня мог-жа ня прызнаць Ад. Станкевіч аб шырокім карыстаньні там, дзе творыцца новая культура, беларускай мовай, аб пачатку дзяржаўнасьці (як вельмі скромна і цяжка гэта выходзіць з пад пяра аўтара) беларускага народу, аб калектыўнай гаспадарцы, аб саюзе народаў.

На заканчэньне трэба адцеміць, што глыбака памыліўся-б той, хто ў парушаных справах дагледзіў-бы якінебудзь акадэмічны адарваны ад нашага сяньняшняга дня спор.

Гэтак ня ёсьць!

Усе тыя сілы ў нашым народзе, якія душой і целам адданы справе сапраўднага нашага адраджэньня, а ў тым ліку і ўзросту культурна - творчага жыцьця беларускіх масаў, імкнуцца, каб з л у ч а н а д л я г э т а й м э т ы б а р а н і ц ь н а ш ы я п р а в ы

на беларускую школу коштам дзяржавы, на беларускі унівэрсытэт у Вільні, на магчымасьць пашыраць асьветную дзейнасьць мас усімі сродкамі, якія да гэтага служаць.

Справа новай беларускай культуры гэта бязумоўна адно з найважнейшых пытаньняў сучаснасьці беларускага народу.

П. СЯРГІЕВІЧ

Зацемкі аб мастацтве

Прыходзяць і мінаюць стагодзьдзі і кожнае з іх інакш трывожыць душу чалавека і кожнае з іх мае новыя кірункі ўва ўсіх галінах людзкога творства.

Пасьля доўгага заняпаду паўстае Беларускі народ да выяўленьня сваіх духовых сілаў, шукаючы старадаўных традыцыяў, а такжа новых дарог ува ўсіх галінах народнага творства.

Адна з найбольш яскравых галін — гэта мастацтва. Занадта грамаднае зроблена разрушэньне помнікаў нашага старадаўняга мастацтва, каб убачыць яго даўнейшы твар, шмат патрэба часу на досьледы, каб улавіць яго дух, бо — як ведама — былі ўплывы з усходу і з заходу. Гэту вялізарную працу павядуць людзі да гэтага прызваныя.

Я тут затрымаюся над выяўленьнем душы ў індывідуальным творстве побач з агульным беларускім адраджэнскім рухам.

Бязумоўна, адраджэнскі ўздым адбіваецца ў творах мастакоў. З гісторыі нам вядома, дзе паўставала разьвіцьцё культуры, там і мастацтва вылівалася ў як найпрыгажэйшых формах. І сягоньня ў беларусаў паўстае пытаньне, як выявіць думку ў плястычнай форме і дзе нам шукаць крыніц, каб узбагаціць сваю душу.

Кожнаму вядома, што перадусім трэба здабыць мастацкую культуру і тэхнічную падгатоўку, інакш кажучы „граматыку“, каб лягчэй выразіць форму.

Але гэтага яшчэ мала: ідзець нам аб твор, у душы напяяны, ідзець аб мастацкі сум да вялікай лініі, каторая адкрывае шырэйшы кругазор будняму дню жыцьця чалавека.

Сучасны рух у галіне тэхнікі вялікімі шагамі ідзе ўперад, стварылася адпаведная да яе і псыхалёгія сягоньняшняга чалавека, каб рабілі ўсё як найхутчэй, каб як найменш затрачваць часу і энэргіі. У значнай меры адбілася гэта і на мастаках. — Учора пачаў абраз маляваць, сягоньня кончыў, асадзіў у рамы і панёс на выстаўку неданошаны свой твор. Можна часта прыраўнаваць цяперашняга мастака да кухара, каторы паказывае сваю кухню і як варыць, але не падае яшчэ сапраўды добрае і сусім гатовае стравы.

Трэба ведаць, што праца, якая ёсьць пладом творча настроенай душы, ня так хутка падаецца. Трэба нам вялікае цярплівасьці даўнейшых майстроў, каторыя працавалі над сваімі творамі цэлымі гадамі, як напр. разьбяры з часу готыку, якія самі сябе лічылі скромнымі каменшчыкамі, а на якіх разьбаваныя фігуры на фасадах готыцкіх сьвятыняў глядзім сяньня, як на нешта вялікае і сапраўды цэннае ў мастацтве.

Праўда, сягоньня жывём у іншых абставінах — падупалі мэцэнаты, што зьяўляліся пераважна падпорай для разьвіцьця мастацтва; прышоў такжа новы лад грамадзкі, прышлі „дэмократычныя“ часы і мастак-маляр ня шукае ўжо падтрыманьня ў адзінкі багатага эстэты, а шукае падпоры ў шырэйшых кругох грамадзянства.

Монумэнтальнае малярства сашло са сьцен на варштат, шырокія малятуры сьвятынь і палацаў звузіліся да цэнтымэтравых велічынь абраза.

Дзеля гэтага першым мастом паміж маляром і грамадзянствам зьяўляецца сяньня выстаўка, іначай кажучы — рынак, дзе маляр чэрпае маральную і матар'яльную сабе падмогу ад грамадзянства.

Выстаўка адначасна зьяўляецца тэрмомэтрам кірункаў, якія праходзяць праз працоўні маляроў, што так часта сяньня сталі браць прыклад са старых прымітываў і дзіцячых рысункаў, або, выкідываючы ўсялякі зьмест абраза, кінуліся ў скрайні футурызм, супрыматызм, конструктывізм, формізм.

Але так як народ, які адраджаецца, ня можа паўтараць старых форм будовы гаспадарства, але мусіць дастасавацца да сучасных праяваў грамадзкага жыцьця, так і ў мастацтве ня можна паўтараць таго, што зроблена ў мінулых стагодзьдзях. Паўстае група за групай мастакоў, каторыя ўсімі сіламі стараюцца разьвязаць сакрэт, якой дарогай хадзілі мастакі клясыкі старой Грэцыі, або рэнэсансу, і ствараецца такім чынам кірунак псэўдоклясычны. Добра аценіць як сьлед значэньне гэтых вялікіх помнікаў старадаўнай культуры, але, паўтараем, іх немагчыма і ня ёсьць гэта заданьнем мастака. Трэба пазнаць іх, але трэба ў творстве сваім адбіць сынтэзу сучасных ідэй грамадзянства, каторыя праходзяць праз прызму душы мастака.

Разумеецца, не аб тое тут ідзе, каб ставіць маляру гатовыя тэмы, над каторымі ён мае працаваць, бо тэму дыктуе яму самае жыцьцё і вонкавыя абставіны, што праходзяць праз яго мастацкую чуткую духовую арганізацыю. — Тут ідзе аб тое, каб парушыць самы глыбокі, жывы і актуальны настрой душы чалавека і адбіць яго вялікай сілай, выражанай у плястычнай форме лініі і колеру.

Паволі Беларускі народ пачынае працу ў што раз то шырэйшых галінах культурнага жыцьця; прыходзяць так-жа людзі, каторыя выяўляюць свой творчы дух і ў плястычнай форме. Сягоньня аднак яшчэ гэта замаладыя сілы, каб можна было выра-

зіць аб іх аканчальны суд. Беларусы, што праходзяць навуку ў чужых школах — усходняй ці то заходняй часьці нашага Краю,— адно павінны памятаць, каб не парваць сувязі са сваім народам і тэй крыніцай, дзе б'е нясьведамае яшчэ жыцьцё, але здаровае і незмэханізаванае цывілізацыяй. І каб ня згубіцца ў ар'ентацыях усходняй ці заходняй школы, у тым ці іншым кірунку — трэба пазнаць самога сябе.

Нам трэба йсьці ў народ, як ішоў Грыг, каторы стварыў найпрыгажэйшыя сымфоніі на падставе норвэскіх народных песень і саг, як расейскія маляры, што слаўна запісалі карту народнага мастацтва, ствараючы абразы на падставе былін і легэнд народных.

Чэсьць тым мастакам, каторыя здолелі сваей песьняй парушыць сонныя душы і змусілі іх імкнуцца да сьвятлейшых берагоў чалавечага шляху і сардэчна па іх сумуюць!

Р. ШЫРМА

Беларускія валачобныя песьні
і іх распаўсюджаньне на гэтым баку савецка-польскай граніцы

Вялікае багацьце абрадавых песень мае беларускі народ.

Сярод іх асаблівае мейсца займаюць песьні валачобныя, або як іх называюць Вялікодныя. Як і большасьць беларускіх абрадавых песень, валачобныя таксама бяруць свой пачатак недзе ў сівой старадаўнасьці і некалі былі цесна зьвязаны са сьвятам Вясны і земляробскай працы беларуса-славяніна. Трэба думаць, што гэта былі песьні-малітвы нейкаму паганскаму богу Вясны, або земляробскай працы.

З боку гэнэзы мэлёдыі і тэкстаў, як неразлучнага цэлага, гэтыя песьні зусім не дасьледаваны. А не дасьледаваны таму, што не праведзена па належнаму ў нас на Захадзе пляновая і сыстэматычная фольклёрызацыя гэтага матар'ялу. Самыя цікавыя і старажытныя з гэтых песень гінуць назаўсёды разам са старэйшым пакаленьнем, якое яшчэ памятуе другую палавіну мінулага сталецьця, але выміраючы нясе ў магілу і гэтыя скарбы.

Самы старажытны від валачобных песень па нашаму будуць песьні „лалоўныя". Прысьпеўкі — „Эй лолам!", або „Ой лоло!" напэўна былі некалі зваротам да паганскага бога, так сама як „Лель", „Лялі" і „Лада". З часам гэтыя словы свой паганска-рэлігійны зьмест згубілі і асталіся па традыцыі, як прысьпеў да валачобных песень.

Пасеяла лешку лёну, эй, лолам.
Пасеяла лешку лёну.
Лешка лёну не ўрадзіла, „

Падарачкі ўкарнацілa эй, лолам.
Пасеяла руту-мяту, — „
Наляцелі шугі-лугі, „
Шугі-лугі, чорныя каўкі. „
— Не дзярэце руту-мяту,
Бо мне руты многа трэбы „
А чашнічкам да шапачкі, „
А мне млодай вянок зьвіці, „
Вянок зьвіці замуж выйсьці „
(В. Бераставічаны, Горадзенскага пав.).

Прысьпеў „эй, лолам", які спатыкаецца на Віленшчыне і Горадзеншчыне, ёсьць сапсуты пад уплывам часу; панашаму „ой, лоло", які захаваўся ў Беласточчыне (в. Пяшчанікі) болей старажытны і адпавядае паганскай сапраўднасьці.

Тонка, тонка ў саду канапелька, ой, лоло.
Яшчэ танчэйша красная паненка „
Ой наляцелі марскія пташэнства, „
Селі на ерыну, росу атранулі
Паванька хадзіла пер'ечка раніла, „
Паненка хадзіла пер'ечка зьбірала,
Пер'ечка зьбірала ў падушачку клала, „
У падушачку клала, бела ложа слала, „
Бела ложа слала, да ложа гадала: „
— Ой, ложо, ложо, хто на табе ляжа? „
— Ой ляжа, ляжа месячык з зарою,
Месячык з зарою, паніч з паненкою, „

Як бачым, у гэтых песьнях, хаця-ж яны і прытарнаваны да Вялікодных сьвятаў, няма ніякага зьместу хрысьціянскага Вялікадня. Нашую думку, што гэтыя песьні сягаюць сваім нараджэньнем значна далей хрысьціянскай эпохі, пацьвярджаюць такжа валачобныя песьні, так званыя „віно".

На балоці, на кракоці,

Дый віно-ж маё зеляное. *)

Ляжаў камень бялюсенькі
На тым камені сядзела зьмейка.
Дзесь узяўся красны панічык.
Красны панічык, малады Андрэйка.
Хацеў зьмейку бічэм цяці.
Бічэм цяці, ёй галоўку зьняці.
Яна стала прасіціся:
— Мой панічу, мой красавічу.
Не сячы мяне, не рубай мяне.
Як ты будзеш жаніціся,
Пушчу сынка за чашнічка,
А донечку за сванечку,
Сама прыду за кухарачку.
Як прышло да таго, то няма нічога:
Не пусьціла сынка за чашнічка,
А донечку за сванечку,
Сама не прышла за кухарачку.
(В. Вялікае Сяло, Пружанскага пав.).

*) Гэты радок — рэфрэн (прысьпеў) трэба паўтараць пасьля кожнага наступнага радка.

Доказам таго, што валачобныя песьні вынесьлі вобразы і звароты яшчэ з праславянскай мітолёгіі, можа служыць тэкст песьні, у якой справа пачынаецца аж „на сінім Дунаі“.

Ой на моры, на сінім Дунаі,
Дый віно-ж, віно зеляное *)

Ляжыць кладка брусаваная.
А масточкі ўсё каваныя.
Тудой ішло 700 коней,
Усе кладачкі пагібаліся
А масточкі паламаліся.
Скуль узяўся красны панічык,
Красны панічык малады Сымонка,
Ляціць бяжыць гукаючы,
Свайго каня шукаючы:
— Вот ня жаль-жа мне 700 коней,
Вот жаль-жа мне аднаго каня:
З яго рота цякло злота,
Ён капыцікам камень разьбівае,
Ён хвосьцікам вулку падмятае,
Ён вушкамі неба падпірае,
Ён вочкамі зорачкі шчытае,
Ён Сымонку паненку шукае.

(В. Яцкава, Валожынскага павету).

Тут ужо зусім выразны астатак паганскага культу, таго адухаўленьня і абагаўленьня прыроды, з якім ведама-ж мусела вясьці жорсткую барацьбу духавенства. У гэтай барацьбе ад „лалымак“ праз „віно“, „зялён явар кудравы“, „вярба“, „бяроза“, валачобныя песьні ў сваім разьвіцьці дайшлі да таго, што дзеючымі асобамі сталі сьвятыя, а прысьпевам да гэтых песень сталі словы: „Хрыстос ускрос, Сын Божы“.

Праўда, усе сьвятыя, паводле валачобных песень, ня маюць характару тых сьвятых, аб якіх кажа нам сьвятое пісьмо. Нідзе не напаткаеш у гэтых песьнях, каб яны маліліся, наадварот усе яны заняты сялянскімі працамі: Юр'я „выпускае росу“, ходзячы па межах „родзіць жыта“, Мікола на кані ў полі, Пятро таксама даглядае жыта, каб ведзьмы каласоў ня зрывалі, а Ільля памагае зьбіраць з поля. Нават не абходзіцца без таго, каб яны не паспрачаліся паміж сабой („шахаваліся-рахаваліся“, каму першаму ісьці ў поле). А Божая Маці

жыта зажынала,
жыта зажынала, ў тры радочкі клала...“

Такім чынам селянін-беларус робіць сваю корэктуру да навукі з гісторыі царквы-касьцёла—усіх сьвятых надзяляе характэрнымі рысамі, якімі сам адзначаецца: практычнасьцю, працавітасьцю, замілаваньнем да роднага поля, ветлівасьцю. Хрысьціянства зрабіла свой уплыў на гэтую галіну нашай народнай твор-

*) Рэфрэн паўтараецца пасьля кожнага наступнага радка.

часьці, але толькі ўплыў, калі можна так сказаць, вонкавы, фармальны, — зьмест-жа астаўся той самы беларускі, земляробскі і з вельмі значнымі адзнакамі паганскай мітолёгіі. Праўда, спатыкаюцца валачобныя песьні, дзе можна бачыць сьляды хрысьціянскага містыцызму. Але і там усё гэта прадстаўляецца неяк па-беларуску.

За прастолам сам Бог сядзіць,
Хрыстос ускрос. *)
Сам Бог сядзіць — лісты пішаць,
Лісты пішаць, Пётру клічаць,
Пётру клічаць, цяжка дышаць:
— Падай ключы пякельныя,
Выбаў душы няверныя... (Іжа, Вялейскага п.).

У розных паветах валачобныя песьні маюць свае назовы. У Беласточчыне, напрыклад, валачобнікаў называюць „валкоўнікамі". Можа таму, што яны ўмеюць добра „валкаваць", гутарыць прыказкамі да гаспадара і гаспадыні, хлапца, дзяўчыны, у залежнасьці ад патрэбы. У Слонімшчыне называюць іх „ралешнікамі".

Звычаі пры ўсіх акалічнасьцях, зьвязаных з гэтымі песьнямі, амаль тыя самыя ў кожнай вёсцы ці мястэчку: песьні гэтыя пяюць на першы дзень Вялікодных сьвят, і толькі прыгаворкі ды зьмест гэтых песень розьніцца сваімі варыянтамі. Хлапцу і дзяўчыне, якім пяюць песьню:

Проці лета, проці цёплага,
Проці цёплага, Вялікоднага,

заўсёды першаму даецца „параданька ажаніцца", а другой, каб

...узрасла, ўскрасла
да Зялёных Сьвят замуж пайшла," —

а гаспадару пяюць:

Дай-жа, Божа, жыці, быці,
Жыці, быці, жыта звазіці,
Жыта звазіці ў гумно злажыці.

Адсюль характэрная філёзофія гэтых песень: рэлігія сялянскай эканомікі —

З аднаго каласочка — жыта бочка,
А з другога ўдвое таго.

Па характару сваіх мэлёдый валачобныя песьні заўсёды пабудаваны ў мажорным ладзе. Звычайна беларуская песьня ведае болей мяккі мінорны лад, або нешта сярэдняе між тым і другім. Да валачобных гэтых асаблівасьцяў застасаваць нельга. Тут ясна і выразна адчуваецца танальнасьць мажорная, цьвёрдая, заўсёды бадзёрая і вясёлая. Магчыма, што векавая няволя на працягу ўсёй гісторыі народу недзе ў падсьведамасьці ад мінулых пакаленьняў захавала імкненьне да лепшага жыцьця, да сва-

*) Рэфрэн паўтараецца пасьля кожнага радка.

боды. Можа гэта сымбаль ускрасеньня народнага, — бо песьні гэтыя толькі ў беларусаў ёсьць.

Які абшар тут у нас на Захадзе займаюць песьні валачобныя?

Нас цікавяць найболей рубяжы этнографічныя. Бо там, дзе этнічная маса насельніцтва беларуская, там песьні гэтыя прадстаўлены вельмі багата; там-жа, дзе маса беларуская сутыкаецца з іншымі народамі, дзе крыжуюцца дарогі розных культур, можна спадзявацца чужых уплываў і нават поўнага выміраньня гэтага віду народнай творчасьці.

Поўнасьцю і дакладна даць адказ на пастаўленае пытаньне даволі цяжка, бо, як было зазначана, этнографія народнай творчасьці ў нас ня вычарпала. Апрача таго бязумоўна ад'емна ўплывае на аб'ектыўнае вывучэньне характарных асаблівасьцяў беларускай народнай культуры і тое, што на нашых абшарах гэтым займаюцца найчасьцей людзі, якім ідэя пазнаваньня беларускай нацыі чужая і вельмі далёкая, — і кажды такі дасьледчык шукае наперад карысьці для тэй нацыі, да якой сам належыць. Але ня глядзячы на гэта, усё-ж такі на падставе ўжо сабраных матар'ялаў можна зрабіць вывад, што песельная творчасьць нашага народу мае такое багацьце па колькасьці і па якасьці, што нават мацнейшы культурна — польскі народ пераймае нашыя беларускія лалымкі і валачобныя.

Каб накрэсьліць мапу распаўсюджаньня гэтых песень, то, пачынаючы з поўначы, трэба заняць усю Віленшчыну і далей паветы: Горадзенскі, Ваўкавыскі, Сакольскі і Беластоцкі. Апошні пункт Беластоцкага павету—в. Тапілец над ракою Наравам—зьяўляецца этнографічным рубяжом паміж беларусамі і польскімі мазурамі. У Пружанскім павеце, хаця слова „валачобнікі" і мае поўныя грамадзкія правы, аднак песьні гэтыя пакуль што запісаны толькі ў Сухапольскай воласьці, у в. Вялікае Сяло, а праз 4 кілямэтры, у в. Ялова, той-жа воласьці, запісана адна валачобная мэлёдыя і да яе адзін куплет тэксту. Песьня вымірае і вымірае таму, што тут скрыжаваліся дарогі культуры расейскай, польскай і ўкраінскай. Праўда, досьледы над гэтым абшарам ня ёсьць поўныя. Магчыма валачобныя яшчэ недзе захаваліся ў Пружаншчыне, асабліва ў лясных раёнах, але на гэта патрэбна спэцыяльных досьледаў.


Па-за ваяводзтвамі Віленскім, Беластоцкім і Палескім валачобныя песьні яшчэ багата захаваліся на ўсім абшары ваяводзтва Наваградзкага.

Валачобная песьня — самая дакладная этнографічная граніца паміж абшарамі з беларускім і польскім насельніцтвам.


Ходзіць пава па вуліцы

Валачобная, (в. Драглі, Сакольскага пав.)

Запісь Р. Шырмы
Муз. апрац. К. Галкоўскага




2. Сьце-ле пё-ра па му-раў-цы, гэй ві-но,
6. Скуль-жа ўзяў-ся буй-ны ве-цер ,, ,,
11. Штож нам панна за дар да-сі ,, ,,



Гэй! па му-- раў---цы, ві-но.
" буй---ны ве---цер, ві-но!
" за дар да---сі, ві-но
сьце-ле пё-ра
скуль-жа ўзяў-ся
штож нам пан-на
3. А за е--ю кра-сна . пан-на, гэй ві--но,
3. А за е-ю
7. Зьве-яў з пан-ны па-він ве-нец " "
7. Зьве-яў па-він
12. А стар-ша-му па-він ве-нец " "
12. А стар--ша-му
3. А за е--ю гэй ві-но.
3. пан-на.
7. Зьве яў ве-нец " "
7. Зьве-яў
12 А стар-ша-му " "
12. ве-нец
кра-сна пан-на мло-да Ган---на ві--но.
цы за-ве--яў ў бы-стры Ду----най, ві---но.
а дру-го-му зло-ты персь--цень, ві--но
Гэй!


Ві – – – – – – – – – – – – – – – но,
4. Пёра бя – рэ
8. Бе – ра – жочкам
13. Са – ма мло – да
4. Пёра бя – рэ вя – нок ві – – е ві – – – – – – – – –
8. Пай-шла Ган – на бе – ра – жоч – кам
13. А трэй – ця – му са – ма мло – да
вя – нок ві – – е ві – но гэй ві – – но
за вя – ноч – кам
як я – го – – да
но, ві – – – – – – – – – – – – но
Coda. Adagio.
Як ба – – ра – – – ва – – – я,
14. Як я – – – гад – – ка ба – – ра – – ва – – я,
Як


ві — шань — ка
як ві — шань — ка са — да — ва — я.
ві — шань — ка

М. ПЯЦЮКЕВІЧ

Беларуская мэлёграфія

(бібліографічны нарыс)

Беларуская народная песьня належыць да тае галіны беларускай этнографіі, якая вельмі мала дасьледавана, мала распрацаваная. Беларуская народная песьня запісывалася прыпадкова, несыстэматычна і бяз жаднай пляновасьці. Запісы роблены пераважна народнымі вучыцелямі, сельскімі псаломшчыкамі і іншымі аматарамі.

Каб правільна запісаць мэлёдыю, трэба быць добрым музыколёгам і пры тым трэба мець адпаведны інструмант — фонограф, пры помачы якога мэлёдыі безпасрэдна ад сьпевака наігрываюцца на валкі. І сусім правільна сказаў польскі музыколёг Церняк, дырэктар народных тэатраў, што народную песьню, народную музыку найлепшы фаховец ня здолее правільна запісаць, бо, паўтараючы тую самую мэлёдыю голасам ці на інструманце, так дакладна не запяе ці не заграе, як першы раз; у кожным наступным паўтарэньні будуць недакладнасьці ў адносінах да першага выкананьня. Значыцца, трэба лічыць за даволі дакладна запісаную песьню ці мэлёдыю музычную толькі тую, якая будзе наіграна фонографам. Гэты інструмант ня так даўна сканструаваны ў Нямеччыне. Цяпер амаль усюды, дзе толькі пляннова вядуцца запісы народнай песьні, выконываюцца яны пры помачы фонографа *).

У чым безпляновасьць запісаў беларускіх народных песьняў?

Іменна ў тым, што ніводны павет, ніводная воласьць не зьяўляюцца дакладна дасьледаваны і не запісаны ўсе віды беларускай народнай песьні. Калі запісаны вясельныя мэлёдыі, то не запісаны іншыя і г. д. Калі-б мы хацелі напісаць монографію, дапусьцім, купальскіх песень, то можам знайсьці ў друках матар'ялы з пару паветаў, а з іншых будуць іншыя, а толькі не купальскія.

Вось гэтая безпляновасьць і несыстэматычнасьць у дасюлешніх работах пераканае нас, што мы ня маем яшчэ комплетных матар'ялаў дзеля напісаньня мэлёграфічнай монографіі, абыймаючай усе землі Беларусі.

Нятолькі з беларускай мэлёграфіяй справа блага прадстаўляецца, ня ў лепшым стане знаходзіцца і польская мэлёграфія, аднак польскія мэлёграфы ў апошнія годы забраліся солідна да

---

*) У нашым краю фонографам запісывала народныя мэлёдыі Літоўскае Навуковое Таварыства ў Вільні. Праца гэта дала вынікі позытыўныя. Фонограф ёсьць у Вільні (Этнографічны Музэй Унівэрсытэту С. Батуры); з яго карысталі Літоўцы. Думаю, што і Бел. Інст. Гасп. і Культуры і Бел. Навук. Таварыства маглі-б скарыстаць з гэтага інструманту.

гэтай работы. Пляновая і сыстэматычная работа над беларускай мэлёдыяй яшчэ і сяньня ня зрушыла з месца ані тут ані ў Савецкай Беларусі.

Праўда, Катэдра Беларускай Этнографіі пры Беларускай Акадэміі Навук (за часоў нацдэмаўшчыны) нешта ў гэтым кірунку рабіла, але як гэта работа вялася — дзеля недахопу дадзеных — трудна сказаць, ведама тое, што выйшаў толькі адзін зборнік беларускіх народных песьняў з мэлёдыямі ў 1928 г., апрацаваны Гарэцкім і Ягоравым.

Як паведамляе беларуская савецкая прэса, матар'ялаў мэлёграфічных у архівах Акадэміі ёсьць шмат, але яны „засьмечаны нацдэмаўскімі установкамі і антысэміцкім элемэнтам"; дзеля гэтага іменна матар'ялы пасьля „чысткі" Акадэміі не маглі ўбачыць сьвету і магчыма не пабачуць.

У гэтым годзе фольклёрная камісія БАН пад кіраўніцтвам народнага поэта Я. Коласа быццам пачынае аджываць, прабуджацца з доўгага лятаргу. Ужо намечаны праекты пляну працы. Але што яна, гэта камісія, зробіць, і як выканае свае пляны, сяголньня ня знаючы вынікаў ейнай працы трудна сказаць. Можна толькі адно заўважыць, што камісія будзе зварачываць увагу перадусім на сучасны пасьлярэвалюцыйны фольклёр, пасьлярэвалюцыйную народную песьню. Адкінуць стары фольклёр — гэта значыць схаваць усе асаблівасьці культурныя і нацыянальныя дадзенага народу, асабліва нацыянальныя.

Сучасны беларускі савецкі фольклёр ня робіць уражаньня агулам чагось беларускага. Ня мае ён ані характарных рысаў географічна-топографічных, ані псыхічных, ані ўрэшце формальных. Сучасная беларуская народная песьня і розныя „частушкі" амаль нічога ня маюць у сабе народнага беларускага. Тэматыка іх — гэта гымны Леніну, Сталіну, Варашылаву і Кагановічу „за шчасьлівае, радаснае і заможнае жыцьцё". Мова—трудна сказаць якая, толькі не беларуская.

Зьбіраньне, запісываньне і гарманізаваньне беларускіх песень пачалося больш-менш у 40-х гадох мінулага стагодзьдзя, хоць першыя „ластаўкі" паявіліся крыху раней — як напр. Чарновска М. (1817 г.) і Шыдловскі І. (1819 г.). У сьлед за Ант. Абрамовічам, які запісываў беларускія народныя песьні у 40-х гадох XIX ст., ідзе цэлы рад зьбіральнікаў беларускай народнай песьні. З. Радчэнко, Э. Романов, Р. Шэйн, Р. Бессонов і інш. Сярод зьбіральнікаў беларускай народнай песьні пачатку XX ст. выдатнае месца займае Ант. Грыневіч, які сабраў да 1000 народных песень. У гэтую пару бачым цэлы рад больш падгатаваных зьбіральнікаў, як напр.: Янчука, Тэраўскага, Равенскага, Прохарава і інш. Над гармонізацыяй працуюць Сокальскі, Танееў, Грэчанінаў, праф. Галкоўскі і інш. Цяпер разгледзім друкаваныя матар'ялы, аб якіх ведаем з тых ці іншых жаролаў. — Спэцыяльнай бібліографіі аб беларускай мэлёграфіі, друкаванай, яшчэ нажаль ня маем. Наш артыкул таксама не зьяўляецца поўнай бібліографіяй беларускай

мэлёграфіі, аднак важнейшыя пазыцыі бібліографічныя з белар. мэлёграфіі чытальнік напэўна знайдзе. Тыя бібліографічныя жаролы, з якіх прышлося карыстаць, не зьяўляюцца дакладнымі; напр. праца Д. Зеленіна „Библіографическій указатель русской этнографической литературы“ 1913 г. падае вельмі мала бібліографічных пазыцый аб беларускай народнай песьні, хоць яны існуюць. Тое самае бачым і ў бібліографіі Фр. Гавэлка і інш.

Праўда, Беларуская Акадэмія Навук у Менску выдала бібліографію этнографіі: „Матарыялы да беларускай бібліографіі. Т. IV. Этнографія“. Менск 1927. 4-о S. XL, 90, 2 nlb., дзе ёсьць спэцыяльны разьдзел аб беларускай народнай песьні (5. Мэлёдыі, музучныя прылады, народнае мастацтва, стр. 76—78, № 1834—1877). Гэтая бібліографія паводле слоў выдаўцоў абымае ўсе матар'ялы вышаўшыя друкам да 1926 г. Праца гэта вельмі цэнная, але як зазначае праф. К. Мошыньскі: „nie wyczerpuje on (разьдзел аб музыцы, М. П.) jednak przedmiotu, aczkolwiek zawiera wiele cennych wskazówek“ *). А калі возьмем пад увагу час ад 1926 г. да апошніх дзён, як у нас так і ў Савецкай Беларусі, то зноў знойдзем шмат пустых мясцоў. Аднак гэтыя пустыя месцы ў меру магчымасьці пастараемся выраўняць тымі пазыцыямі, якія падае „Летапіс беларускага друку“ за 1926—35 гады. Адносна выданьняў віленскіх, то нятрудна будзе падаць цалком дакладныя інформацыі.

Бібліографічны перагляд песенных матар'ялаў распачнём перш ад заходняй часьці Беларусі. Да песень, сабраных тут, належаць: 25 песень беларускіх і польска-беларускіх, запісаных у Сакольскім пав. ведамым філёлёгам праф. І. Бодуэн-дэ-Куртэнэ. Гэтыя песьні выдрукаваны ў „Zbiór wiadomości do antropologji krajowej“, Кракаў. Т. 16. 1892 і Т. 18. 1895.

З беларуска-польскага этнографічнага пагранічча (каля Нарвы, вёска Трасьцяніца) Раманаў запісаў 5 белар. нар. песень (зьмешчаны ў зборніку: „Бѣлорусскій сборникъ“ ч. VII. 1910 г.).

Адну мэлёдыю з павету Ваўкавыскага знаходзім у зборніку Шэйна „Матеріалы для изученія быта и языка русскаго населенія Сѣверо-Западнаго края“ Т. І. ч. 1. 1897 г.

Як паведамляе М. Федароўскі ў уступе да першага тому свайго „Ludu Białoruskiego...“ мэлёдыі да яго зборнікаў запісаў Ян Карловіч. Гэтыя мэлёдыі знаходзяцца ў Варшаве пад апекай праф. Панятоўскага і Пяткевіча. Мэлёдыяў да тэкстаў беларускіх ёсьць 727 і 201 да польскіх, запісаных на Беларусі. Усе ноты гэтых песень перапісаныя на чыставік і падсыгнаваныя літарамі J. K. (=Ян Карловіч); частка песень мае літары Tr. (=Трачык, студэнт львоўскай політэхнікі і аднача сна вучань Карловіча).

Над песьнямі ў гэтай часьці Беларусі працуе сучасны беларускі мэлёграф Рыгор Шырма, які ў 1929 г. сабраў і выдаў: „Беларускія народныя песьні“ Вып. 1. Вільня. У зборніку зьмешчаны

*) Lud Słowiański. T. III, zesz. 1.

34 песьні. Апрача гэтага Р. Шырма ў рукапісах мае каля 1000 народных песень, запісаных пераважна ў паўдзённай частцы Краю. Даволі многа працаваў над беларускай народнай песьняй сьв. памяці Альбін Стэповіч. Ён ня толькі зьбіраў песьні, але і гармонізаваў для беларускіх хораў.

Далей, хоць не сыстэматычна, працуе тут над бел. народнай песьняй праф. К. Галкоўскі (ён толькі гарманізуе), а таксама ад часу да часу пасьвячае ня мала ўвагі бел. песьні камп. Грэчанінаў, які цяпер пражывае ў Францыі. У прошлым годзе на маё імя прыслаў больш 20-ці народных песень з тэкстам і нотамі з Браслаўскага павету самавук-мэлёграф Алякс. Мілевіч з засьц. Карчы; гэтыя песьні я перадаў Таварыству Прыяцеляў Беларусаведы пры У.С.Б. Вельмі ўмела і інтэнсыўна працуе над зьбіраньнем і апрацовываньнем бел. нар. песьні малады і вельмі здольны беларускі камп. Валынчык, б. вучыцель сьпеву ў Наваградзкай Беларускай Гімназіі. Наскольні ведама, Валынчык мае шмат запісаных песень з Наваградчыны і Палесься. У Сьвянцянскім пав. з ваколіц м-ка Камаяў зьбіраў бел. нар. песьні праф. Бр. Руткоўскі. З гэтых песень, запісаных праф. Руткоўскім, 8 зьмешчана ў зборнічку: „Pieśni ludowe ziemi Wileńskiej i Nowogródzkiej — zebrała Br. Gawrońska. Wilno 1935“.

З павету Лідзкага запісаў і апрацаваў некалькі нар. песень сьв. памяці сьвяшчэньнік Т. Уладзімерскі; рукапісы гэтых песень знаходзяцца ў гр. Шырмы.

Апошнімі часамі наглядаецца вялікае зацікаўленьне белар. народнай песьняй. Як самыя беларусы, так і чужынцы працуюць у гэтым кірунку. Напрыклад, у мінулым годзе, летам, з даручэньня праф. Віленскай Музычнай Школы, Шэлігоўскага, у паветах Дзісьненскім і Браслаўскім запісываў бел. народныя песьні вучань успомненай школы Г. Цытовіч — з паходжаньня беларус.

З папярэдніх часоў існуюць яшчэ такія зборнікі белар. нар. песень з заходняй часткі Беларусі: А. Грыневіч і Зязюля „Беларускія песьні з нотамі“ т. I. 1910 і томік 2. 1912 г.; песьні пераважна запісаны ў Дзісьненьскім і Ашмянскім паветах; з ваколіц возера Сьвір запісаў некалькі бел. нар. песень ведамы беларускі рэвалюцыянер, пісьменьнік і адначасна этнограф-аматар Ад. Гурыновіч,—зьмешчаны ў „Zbiór wiad. do antrop. krajowej“. Кракаў 1893. Т. XVII, бач. 136. Трэба таксама адзначыць і песьні з Дзісьненшчыны, якія запісаў чех А. Чэрны ў ліку 22 і выдрукаваў у „Zbiór wiad. do antrop. krajowej“. Т. 18. 1895 г. З гэтага-ж павету дае нам 36 мэлёдыяў абрадавых і інш. Э. Раманаў—„Бѣлорусскій Сборнік“ ч. 1.

Беларускі сьпеўнік. Сшытак 1. Вільня 1929.

Рагоўскага Л.: Беларускі песеньнік з нотамі для народных і школьных хораў. Кн. 1. Вільня 1911. — Беларускі песеньнік з нотамі для народных і школьных хораў. Выд. 2. Вільня 1918.

(д. б.).

ХРОНІКА

═ 10-ці годзьдзе Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Сёлета Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, адна з найбольш заслужаных і дзейных беларускіх культурна-асьветных арганізацыяў, будзе сьвяткаваць дзесятую гадаўшчыну свайго існаваньня. Згодна з пастановай Цэнтральнага Ураду Інстытуту, урачыстае сьвяткаваньне гэтага юбілею адбудзецца ўвосень.

═ Сёлетнім беларускім юбілярам зьяўляецца і Беларуская Друкарня імяні Францішка Скарыны ў Вільні. 1-га траўня мінула дзесяць год ад заснаваньня друкарні. Друкарня, хоць зьяўляецца ўласнасьцю прыватнай супалкі, дзеля ідэовага накіраваньня сяброў супалкі і такога-ж накіраваньня працаўнікоў друкарні, шмат прычынілася да развою беларускай адраджэнскай думкі і сталася аднэй з заслужаных беларускіх установ.

═ Віленскі Аддзел Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў бягучым квартале, як і ў папярэднім, зарганізаваў ужо некалькі лекцыяў з цыклю гісторыі Беларусі. Прэлегентамі выступалі: а. В. Гадлеўскі, старшыня Інстытуту, і інж. А. Клімовіч, старшыня Віленскага Аддзелу. У гэтым-жа часе адбыўся адзін канцэрт беларускай народнай песьні, арганізаваны Аддзелам Інстытуту. Выступаў Хор Інстытуту.

═ 8. III. адбылося ўрачыстае паседжаньне Беларускага Навуковага Т-ва ў Вільні, у чэсьць 450-тых угодкаў нарадзінаў першага беларускага друкара д-ра Францішка Скарыны. Былі прачытаны два рэфэраты аб Скарыне і яго друках, і пастаноўлена дамагацца ад комунальных уладаў м. Вільні перайменаваць Вялікую вуліцу на вуліцу імяні Фр. Скарыны.

═ 15 сакавіка ў салі Сьнядэцкіх віленскага Унівэрсытэту адбыўся вечар беларускай паэзіі і песьні. У прагаму ўходзілі аўторэцытацыі і рэцытацыі твораў перадавых зах.-беларускіх паэтаў Міхася Машары, Максіма Танка, Натальлі Арсеньневай, Міхася Васілька, А. Бярозкі і Хв. Ільляшэвіча, — рэфэрат м-гра Ст. Станкевіча аб маладой беларускай паэзіі, і канцэрт беларускай песьні, выкананы хорам гр. Р. Шырмы і солісткамі.— Вечар удаўся. Усе пералічаныя паэты, апроч Арсеньневай, на вечары былі прысутнымі.

═ „Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej“ — гэта дысэртацыйная праца б. сябры рэд. калегіі нашага часапісу, м-гра Ст. Станкевіча. Вышла нядаўна з друку частка першая. Аўтар разгледзіў пару польскай романтычнай літаратуры да 1830 году і ўдачна выявіў беларускі фольклёр, як асноўны элемэнт у польскай романтычнай літаратуры разглядаңай пары.

═ Беларускі пісьменьнік і наш супрацоўнік Вінцук Адважны па доўгім прабываньні на чужыне прыяжджае на Бацькаўшчыну. Мае намер у канцы траўня быць у Вільні.

* * *

═ Група навуковых працаўнікоў Інстытуту Гісторыі БелАН. пад кіраўніцтвам акад. Шчарбакова закончыла працу „Гісторыя Беларусі ў дакумантах і матарыялах“ у двух томах. Першы том, што ўжо друкуецца, мае 40 аркушоў. Ён абымае пэрыяд з старажытных часоў да канца XVIII-га стагодзьдзя. Публікуецца рад арыгінальных дакумантаў і мататарыялаў з гісторыі Беларусі з літоўскай мэтрыкі а таксама знайдзеных у архівах Масквы, Ленінграду, Кіева, Днепрапятроўска і БССР. Другі том абымае пару з XVIII стаг. да 1917 г.

═ Інстытут Геолёгіі Беларускай Акадэміі Навук працуе над утварэньнем геолёгічнай карты БССР у маштабе 1 : 200,000. Дзеля гэтага

ўжо выканана геолёгічнае фатаграфаваньне на плошчы да 50 тысяч квад. кілёмэтраў. Сёлета мае быць сфатаграфавана яшчэ 9 тысяч кв. кілёмэтраў тэрыторыі. Цалком карта будзе гатовай у 1940 годзе.

═ Беларуская Акадэмія Навук працуе над зьбіраньнем і вывучэньнем фольклёру народаў БССР. Ужо гатовы да друку зборнік „Беларускі савецкі фольклёр". Адначасна рыхтуецца кніжка „Прыгон у фольклёры". Дзеля гэтага ўжо сыстэматызавана 1000 казак, песень, расказаў, якія адносяцца да жыцьця беларускай вёскі ў першай і другой палавіне XIX веку.

═ Акадэмік Беларускай Акадэміі Навук Нікольскі сабраў багаты фольклёрны матарыял — казкі. Ён сыстэматызаваў больш 100 казак, значная частка якіх ня была дагэтуль апублікавана. Адначасна Нікольскі падрыхтаваў да друку працу аб беларускіх народных прыказках.

═ Сёлета прыпадае 15-я гадаўшчына існаваньня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску і стагодзьдзе існаваньня горацкага сельска-гаспадарчага інстытуту. Улады Савецкай Беларусі дзеля падрыхтаваньня і правядзеньня гэтых юбілеяў паклікалі спэцыяльныя камісіі.

═ У мінулым годзе прэзыдыюм БелАН. абвесьціў конкурс на лепшую навукова-дасьледчую працу. На конкурс прыслана 16 прац. Нагароджаны 5. Сярод іх праца праф. Дарожкіна — „Вынікі сямігадовага вывучэньня парошыстай паршы бульбы ў БССР", праф. Ламцёва — „Беларуская граматыка". Дзеля правядзеньня такога-ж конкурсу сёлета, прэзыдыюм БелАН. утварыў камісію ў складзе Шчарбакова, Бурстына, Матулайціса, Коласа, Вальфсона, Афанасьева і праф. Шпенцэра.

═ 17 — 19 лютага адбылася ў Менску першая ўсебеларуская (Сав. Беларусь) алімпіяда мастацкай самадзейнасьці работнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў. У алімпіядзе прыймалі ўдзел лепшыя ўчасьнікі саўгасных і міжсаўгасных алімпіяд у ліку 160 чалавек. Выступалі хоры, джазы, аркестры, выступалі цымбалістыя, гарманістыя, скрыпачы, дэкляматары, пачынаючыя пісьменьнікі. Беларускі, рускі, украінскі фольклёр займаў значнае месца ў выступленьнях учасьнікаў.

═ У конкурсе на лепшую песьню, абвешчаным цэнтральным органам ВКП(б)—часапісам „Праўда", прымалі ўдзел паэты ўсіх рэспублік СССР, у тым ліку і паэты БССР. Народнаму паэту Янку Купале конкурсны суд прызнаў 2-ю нагароду — за песьню „Выпраўляла маці сына". Трэцяя прэмія прысуджана беларускаму савецкаму паэту Андрэю Александровічу — за песьню „Серго Орджанікідзе" (!).

═ Працаўнік геолёгічнага інстытуту БелАН. Цэйтлін напісаў навукова-дасьледчую працу, цікавую для характарыстыкі прыродных багацьцяў БССР.

═ Беларускі савецкі кампазытар Туранкоў апошнім часам згарманізаваў дзьве беларускія народныя песьні: „Ой зелена, зелена" і „Пашла баба па сялу", а кампазытар Равенскі—песьню „Ой загуду" і напісаў музыку на верш Купалы „Лянок".

═ У сувязі з артыкуламі „Праўды" супроць фармалізму і натуралізму ў розных галінах мастацтва, як па ўсім СССР, так і ў БССР адбыліся і адбываюцца дыскусыйныя вечары, на якіх працаўнікі паасобных галін мастацтва (літаратуры, тэатру, архітэктуры, музыкі, жывапісі і т. д.) разважалі пытаньні барацьбы за добрую якасьць у мастацтве.

Выдавец: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Адказны Рэдактар: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Др. Я. Станкевіч, Зьмена граматыкі беларускага языка ў БССР. Вільня, 1936.
Ст. Станкевіч, Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej, ч. 1. Вільня, 1936.
Праф. д-р І. Огіенко, Сучасна українська літературна мова, 1935.
„ Складня української мовы, 1935.
Д. Донцов, Патріотизм. Львоў, 1936.
Маладая Беларусь, кн. 1. Вільня, 1936.
Летапіс Таварыства Беларускае Школы, № 1—3. Вільня, 1936.
Беларуская Борць, № 3. Вільня, 1936.
Вістнік, кн. 4, Львоў, 1936.
Шлях Нацыі, ч. 3—4. Львоў, 1936.
Обрії, ч. 8, 9, 10, 11, 12, 13, 14. Львоў, 1936.
Рідна Мова, ч. 4, 5. Варшава, 1936.
Життя і Знання, ч. 1, 2, 3, 4. Львоў, 1936.
Назустріч, ч. 9. Львоў, 1936.
Наш Світ, ч. 3, Луцк, 1936.
Богословія, кн. 1. Львоў, 1936.
Нова Хата, Львоў, 1936.
Slovansky Prehled, č. 3. Прага, 1936.
Katolik, č. 3, 4, 6. Прага, 1936.
Život, č. 5, 6. Прага, 1936.
Sprawy Narodowościowe, № 5, 1935.
Oriens, сшыток 2. Кракаў, 1936.
Pax, № 4, 5, 6, 7—8. Вільня, 1936.
Włóczęga, № 3, 5.Вільня, 1936.

Ад Рэдакцыі:

Друкаваньне наступнай (3-й) кніжкі „Калосься“ пачнецца 1-га чэрвеня. Просім дзеля гэтага паважаных супрацоўнікаў парупіцца прысланць да друку матарыялы ў тэрміне.

